Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 254 (5087)
ЛІСТАПАДА
14
СЕРАДА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

15 лістапада ў 9 гадзін вечара ЦК КП(б)Б сумесна з наркаматам мясцовай прамысловасці праводзіць РАДЫЁПЕРАКЛІЧКУ па пытанню АБ ХОДЗЕ ВЫКАНАННЯ ПРОМФІНПЛАНА І МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ПАСПЯХОВАМУ СКАНЧЭННЮ ГАСПАДАРЧАГА ГОДА.

У радыёстудыях павінны прысутнічаць усе трыкутнікі прадпрыемстваў Беларусі і даць адказы на пытанне аб рабоце іх прадпрыемстваў. Перакліччу праводзяць сакратар ЦК КП(б)Б тав. ВАЛКОВІЧ, загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б тав. ГОТФРЫД, нарком мясцовай прамысловасці тав. БАЛЦІН, уп. Наркомлеса тав. РОЗІН, уп. Наркомхарчпрома тав. ГЕОРГАДЗЕ і уп. Наркампегпрома тав. БЕХЦЕРАЎ.

РЭДАКТАРАМ РАЁННЫХ ГАЗЕТ

Неадкладна на рэдакцыйных нарадах прапрацуйце перадавы артыкул «Правды» ад 12 лістапада «Печать в избирательной кампании». У выкананне ўказанняў гэтага артыкула вызначце практычныя мерапрыемствы па забеспячэнню лепшага ўдзелу нашай газеты і рабселькораў у перавыбарах советаў і ў падрыхтоўцы да III ўсебеларускага з'езда рабселькораў.

Штодзённа дасылайце культпропу ЦК інфармацыю аб удзеле друку і рабселькораў вашага раёна ў перавыбарах советаў.

Загадчык Аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б КОНІК.

БССР ПАВІННА ПЕРШАИ ЗАКОНЧЫЦЬ ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ

Ганебныя тэмпы апошняй пяцідзенкі прывялі да таго, што на 10 лістапада ордзнаносная Маскоўская вобласць нас абагнала. На 10 лістапада Маскоўская вобласць выканала план ільнозагатовак на 77,9 проц., у той час, як БССР толькі 74,3 проц.

Баявая задача ўсіх райкомаў, райвыканкомаў, палітаддзелаў, сельсоветаў, усіх совецкіх і калгасных актывістаў — рашуча ўзмацніць работу па арганізацыі апрацоўкі ільну і яго здачы дзяржаве з тым, каб на 20 лістапада план ільнозагатовак быў поўнасцю выканан.

Асабліва рашаючае значэнне маюць наступныя дзевяць раёнаў: Дубровенскі, Мсціслаўскі, Гарадоцкі, Чавускі, Горацкі, Шклоўскі, Расонскі, Талачынскі, Лёзненскі, кожнаму з якіх трэба здаваць па 200 і больш тон і запазычанасць якіх складае 45 проц. усяго таго, што трэба яшчэ загатовіць па БССР.

Няхай-жа ведаюць комуністы, комсамольцы, усе актывісты гэтых раёнаў, што перш за ўсё ад іх работы залежыць поспех барацьбы БССР за першае месца ў ільнозагатоўках.

Патрэбны не заклінанні, а канкрэтныя большэвіцкія справы

Зараз, калі рад раёнаў ужо не толькі выканалі, але і перавыканалі план ільнозагатовак, асабліва ясна, асабліва наглядна відаць, што карэнні адставання раду другіх раёнаў (Дуброўна, Чавусы, Мсціслаўль, Магілеў, Чэрвень і інш.) трэба шукаць не ў якіх-небудзь «аб'ектыўных» прычынах, а выключна ў НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ КІРАЎНІЦТВЕ з боку РК, РВК, а ў частцы раёнаў і палітаддзелаў. «МЫ стаім на чале ўлады, МЫ распалагаем сродкамі дзяржавы, МЫ заклікаем кіраваць калгасамі і МЫ павінны несці усю паўнату адказнасці за работу ў вёсцы» (СТАЛІН).

Тыповымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца ЧАВУСЫ. Чаму, напрыклад, Чавусы ганебна цягнуцца ў хвосце? Таму, што там працуюць метадамі, якія рэзка раскрытыкаваў тав. Сталін яшчэ ў 1933 годзе, якія былі асуджаны XVII з'ездам партыі. У Чавусах, напэўна, ЧЫТАЛІ і прамову тав. Сталіна аб рабоце ў вёсцы і рашэнні XVII з'езда, але працуюць там па-старому. Якімі метадамі працуюць у Чавусах? Там любяць засядаць, выносіць рэзалюцыі, пасылаць упаўнаважаных, склікаць бясконцыя нарады, на гэтых нарадах браць ад старшынь калгасаў абяцанні. Там любяць «мабілізоўваць», «накачваць» і т. д. Адным словам, «рыпяць пер'ямі», А ЖЫЦЦЁ ІДЗЕ МІМА КІРАЎНІЦТВА. БО НЯМА КАНКРЭТНЫХ БОЛЬШЭВІЦКІХ СПРАЎ.

Сакратар Чавускага РК т. Кулікаў рэкамендуе як лепшага ўпаўнаважанага т. ТУРЧЫКАВА. Што-ж гаворыць тав. Турчыкаў: «Што я магу зрабіць. Склікаў нараду, сказаў, каб мабілізаваліся, каб арганізавалі чырвоны абоз. Не пярэчылі, абяцалі. Я быў упэўнен, што выканаюць, але падвялі, нічога не вышла». Параўнайце яго заяву з заявай ударніцы калгаса «Новае жыццё» т. ГАРБАЧЭНКІ Наталлі, што «калі-б у нас правільна налічвалі працадні і выдавалі авансы хлеба на апрацоўку ільну, мы-б дзень і ноч працавалі»,—КАБ СТАЛА ЯСНА, ШТО ЖЫЦЦЁ ІДЗЕ МІМА Т. ТУРЧЫКАВА, А ДАКЛАДНЕЙ ГАВОРАЧЫ МІМА ЧАВУСКАГА РАЁННАГА КІРАЎНІЦТВА.

У чавускім, як і ў іншых адстаючых раёнах, ёсць не адзін дзесятак надрэнных большэвікоў. АЛЕ ІХ НЕ ВУЧАЦЬ ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ПРАЦАВАЦЬ. Уявіце сабе, калі-б т. Турчыкаў замест таго, каб займацца балбатнёй аб чырвоным абозе і броць «абавязацельствы» са старшынь калгасаў, кожны дзень абслугоўваў-бы хоць 2 калгасы, пераключыў-бы там асноўную масу калгаснікаў на апрацоўку ільну, праверыў-бы ці запісваюцца асобна ільняныя працадні і калі не, то прымусіў-бы брыгадзіраў і рахункавода выправіць гэту справу ў 1-2 дні; калі-б ён праверыў правільнасць налічэння ільняных працадзён, раст лумачыў-бы калгаснікам, што ўрад выдаў закон аб налічэнні 2 працадзён за выкананне дзённай нормы на апрацоўцы ільну і ў сваёй прысутнасці і прысутнасці калгаснікаў прымусіў-бы рахункавода рэалізаваць гэты закон; калі-б тав. Турчыкаў праверыў на працягу дня хоць-бы ў двух калгасах, ці атрымалі праўленні хлеб у Заготільне, ці выдае яно авансы хлеба па ільняных працаднях і ў выпадку сабатажу гэтай справы прымусіў-бы гэта зрабіць (праверыўшы праз пару дзён) неадкладна; калі-б тав. Турчыкаў, наведзваючы калгас за калгасам, арганізаваў-бы там соцспаборніцтва сярод трапальшчыц, чорную і чырвоную дошкі, дагаварыўся-б з праўленнем аб выдзяленні прэміяльнага фонда для ўдарніц і ўдарнікаў; — ТАДЫ-Б У СЕЛЬСОВЕЦЕ ТАВ. ТУРЧЫКАВА ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ АДРАЗУ-Ж УЗМАЦНІЛІСЯ-Б НЕ Ў ДВА І НЕ Ў ТРЫ, а МОЖА БЫЦЬ І Ў ПЯЦЬ РАЗ. Але тав. Турчакова і інш. актывістаў райком і палітаддзел не вучаць працаваць КАНКРЭТНА, АПЕРАТЫЎНА, ПА-СТАЛІНСКУ.

У Чавусах любяць балбатаць і заклінаць. А калі-б члены бюро РК, члены прэзідыума РВК, працаўнікі палітаддзела, інструктары РК, старшыні сельсоветаў (а толькі-ж такіх КІРУЮЧЫХ работнікаў у Чавускім раёне набярэцца не менш 35-40 чалавек) канкрэтна заняліся пытаннямі апрацоўкі ільну і загатовак, у двух трох калгасах, або сёлах КОЖНЫ, то ільнозагатоўкі Чавусы маглі-б даўно закончыць, як іх закончыла Орша, Сянно, Менск, Касцюковічы і інш. перадавыя раёны. Хіба, скажам, у Сянно, Касцюковічах больш актыў, чым у Чавусах? Зразумела, не. Адрозненне гэтых і іншых перадавых раёнаў ад Чавусаў, Дуброўны, Магілева і т. д. заключаецца толькі ў тым, што тут не займаюцца балбатнёй і заклінаннямі, а ПА-ДЗЕЛАВОМУ, КАНКРЭТНА пра водзяць у жыццё ўказанні ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб ільнозагатоўках.

Падмена канкрэтнай работы ў Чавусах балтатнёй і заклінаннямі асабва ПАГУБНА АДБІВАЕЦЦА НА НЯСЦІ ЗДАВАЕМАГА ІЛЬНОВАЛАКНА. Чавусы здаюць валакно на паўтара нумара ніжэй задання. Хіба лён у Чавусах горшы, чым у Сянно, Оршы, Менску і т. д. Не, уся справа ў тым, што АГРАТЭХНІКАЙ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ У ЧАВУСАХ НЕ ЗАЙМАЮЦЦА—у выніку мнуць і трэплюць ГАРАЧЫ лён, трапаны лён, як правіла, не сартуюць, пры пасадцы ў яўню трасту не сартуюць і т. д. Чавусы, як і іншыя адстаючыя раёны, атрымалі ўжо неаднаразовыя папярэджанні. Мы пытаем: чаго яшчэ чакаюць сакратар райкома Кулікоў, старшыня РВК Буры, начальнік палітаддзела Кучынскі? Калі ў Чавусах перастануць балбатаць і заклінаць і займуцца канкрэтным, аператыўным кіраўніцтвам ільнозагатоўкамі? Няхай у Чавусах успомняць словы т. Сталіна, што «балбатунам не месца на аператыўнай рабоце» і зробяць усе неабходныя вывады. К 20-му лістапада ў Чавусах, як і ў кожным РАЁНЕ БССР, ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПОЎНАСЦЮ ЗАКОНЧАНЫ.

ПОЎНАСЦЮ ПАДРЫХТАВАЦЬ ТРАНСПАРТ ДА ЗІМЫ

Калі-б сёння ўспялася мяцеліца і адразу ўдарыў мароз, то можна проста сказаць, што многія ўчасткі транспарта аказаліся-б неадольнымі. Гэта з усёй выразнасцю паказваюць рэзультаты рэйда, праведзенага па МВБ чыгункі з 30 кастрычніка па 3 лістапада газетамі «Звязда», «Большевистский путь», журналам «Большэвіцкі друк» і мясцовымі газетамі. Многа вялікіх і малых недаробак у падрыхтоўцы да зімы выкрыта ў Оршы, Барысаве, Полацку, Віцебску і Менску.

Вось узяць буйнейшы вузел — Віцебскі. Паравозны парк (начальнік дэпо Ефімаў) — гэты найбольш уязвімы ўчастак — да зімы яшчэ не гатоў. Толькі 55,3 проц. машын атрымалі пашпарты гатоўнасці да зімы. Астатнія па тэхнічнаму стану не могуць быць прызнаны спраўнымі. Асноўным бічом тут як і ў большасці дэпо, з'яўляецца нізкая якасць рамонту, паўторнасць. Адсутнічае цвёрды парадак пры прыёмцы паравоза з рамонту. Слабая дысцыпліна працы. Не зацеплены і не пашкляны памяшканні, не адрамантаваны варштаты, не хапае інструментаў. Водаспажыванне таксама не прведзена ў парадак. Няма ланцугоў для паварочвання рукавоў водаяпорных калонак. Пры калонках няма гідральных ліхтароў. Незакончана ацяпленне калодзежаў. Яшчэ няма належнай падрыхтоўкі і да снегабарацьбы. Снегаачышчальнікі стаяць неправеранымі на запасных шляхах. Не хапае снегавых шчытоў і калоў. Не ўсюды яшчэ ёсць дзелавая дагаворанасць з калгасамі на рабочую сілу і не арганізавана падрыхтоўка да сустрэчы і абслугоўвання яе.

Рэйдам выкрыты зусім нецярпімыя адносіны да патраб рабочых з боку раду чыгуначных чыноўнікаў. У Віцебску не разданы рабочым вуала адпушчаныя гартопам 2175 ордэраў на дровы. Профсаюзныя кіраўнікі (старшыня райпрафсача Дзімітровіч) нават не паклапаціліся атрымаць гэтыя талоны ад гартопа. Нічога не робіцца і для забеспячэння рабочых зімовай спецвопраткай.

Брыгады рабкораў знайшлі шматпенармальнасцей і ў вагонных дэпо, у пакгаузах, на стрэлачных пастах і т. д. У радзе выпадкаў рабкоры дабіваліся неадкладнага знішчэння выяўленых недахопаў.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб усе недахопы ў падрыхтоўцы да зімы, якія выяўлены рабкораўскімі брыгадамі, былі неадкладна знішчаны. Партыйныя, гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі чыгункі павінны з усёй сілай абрушыцца на гэтыя недахопы. Трэба неадкладна забяспечыць бесперабойную работу транспарта ў зімовы час.

ЧАМУ НАЗНАЧАНЫ НОВЫЯ ВЫБАРЫ У ВЁСЦЫ ЗАГАРАНЫ, МАЗЫРСКАГА РАЁНА?

ПАРУШАНЫ ПРЫНЦЫПЫ ВЫБАРЧАГА ЗАКОНАДАЎСТВА

МАЗЫР, 13. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Прызначаны на 8 лістапада выбарчы сход у в. Загараны. Прудкоўскага сельсавета не адбыўся: з'явілася толькі адна трэцяя частка выбаршчыкаў. 10 лістапада выбаршчыкі прышлі на сход амаль усе, але выбары ўсё-ж не адбыліся. Як толькі быў зачытан спіс кандыдатур, рэкамендаваных партыйна-комсамольскім ядром, у памяшканні падняўся шум. Асобныя галасы выкрыквалі: «Не трэба нам гэтых людзей, мы выберам другіх». І тутжа адразу пасыпаліся прозвішчы дадатковых кандыдатур. Дапоўніўшы спіс, старшыня схода, член сельскай выбарчай камісіі тав. Барысенка прыступіў да галасавання. Першай была названа кандыдатура старшыні мясцовага калгаса т. Кашпера. На пытанне, хто за, падняўся не больш 20 рук. Астатнія выбаршчыкі галасавалі супроць.

Такі-ж лёс напаткаў усе астатнія рэкамендаваныя кандыдатуры. Тады Барысенка паклаў спіс у папку і абвясціў: выбары лічу не адбыўшымися, сход пераносіцца на заўтра. Выбаршчыкі разышліся па хатах. Барысенка разам з інструктарам РК комсамола тав. Ольха таксама спакойна пашлі адпачывань. Як быццам нічога асаблівага не здарылася. Яны не задумаліся над прычынамі зрыву схода. Ім нават і не прышло ў галаву, што тут праявілася на сутнасці кулацкая работа. Барысенка і Ольха спакойна адпачывалі, а кулацкія элементы пашыралі ў гэты час сваю антысовецкую работу сярод адсталых жанчын-аднаасобніц.

На заўтра на выбарчым сходзе сабраліся амаль адны жанчыны. Прышлі і адразу паднялі шум, а аднаасобніца Ражок Елізавета пачала выкрыкваць: «Не трэба нам рэкамендаваць, мы і самі ведаем, каго выбіраць». Барысенка і Ольха разнервараваліся і загадалі Ражок выйсці са схода. Яна пакінула памяшканне. А за ёю пашлі са схода ўсе аднаасобнікі.

— Усяго добрага, — сказаў ім услед Барысенка. — Мы і без вас абыдземся.

Наспех усім спісам былі прагаласаваны калгаснікамі, што асталіся на сходзе, рэкамендаваныя кандыдатуры. І на гэтым агідная гісторыя «выбараў» была закончана.

Чаму так здарылася, чаму выбаршчыкі вёскі Загараны раскалоліся на два лагеры — калгаснікаў і аднаасобнікаў? Таму, што партыйна-комсамольскае ядро сельскай выбарчай камісіі і ўпаўнаважаныя ГК і РВК Літвінаў і Поляк сцяной адгарадзіліся ад аднаасобнікаў, з імі не праводзілі ніякай масавай работы перад выбарамі. Нават у спіс рэкамендаваных ні адной кандыдатуры ад аднаасобнікаў уключана не было, хоць у вёсцы аднаасобнікі складаюць 70 проц. гаспадарак.

Гэту палітычную блізарукасць і бяздзейнасць выкарысталі ў сваіх мэтах кулакі і іх падпявалы. Яны праводзілі тайныя сходы аднаасобнікаў і агітавалі не галасаваць за калгаснікаў. Асабліва кулакі апрацавалі адсталых жанчын-аднаасобніц. Гэта і з'явілася прычынай абору адных жанчын на выбары, іх шуму і крыку на сходзе.

Аказваецца, у вёсцы Загараны многа кулакоў і заможнікаў, выкарыстаўшы прытупленне класавай пільнасці сельсовета і партыйнай арганізацыі, схаваліся ад совецкіх законаў. Больш таго, сельская выбарчая камісія (старшыня — комуніст Пюро) свядома не занесла некаторых кулакоў у спіс лішэнцаў выбарчага права. Узяць хоць-бы Пашкоўскага Алеся. Ён і ўсе члены яго сям'і ў мінулым годзе выбарчымі правамі не карысталіся, а сёлета сельская выбарчая камісія «прагледзела» і не занесла яго ў спіс лішэнцаў. Больш таго, на выбарчым сходзе нават прысутнічалі пазбаўленыя выбарчага права (Піскун Анані і яго жонка Марыля).

У гэтай вёсцы ёсць шмат аднаасобнікаў, якія сабатуюць выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай. Некаторыя з іх не выканалі яшчэ хлебапаставак і бульбапаставак, не гаворачы ўжо аб малацьбе і мясе, а ільновалакна амаль яшчэ ніхто не здаў. Вось тут і арудуе класавы вораг, праводзячы сваю антысовецкую работу, а партыйцы, комсамольцы і раённыя ўпаўнаважаныя аказаліся палітычна блізарукімі. Замест выкрыцця кулакоў і іх падпявал, замест арганізацыі працоўных аднаасобнікаў вакол задач выбараў, Барысенка і Ольха сваім голым адміністраваннем на выбарчым сходзе па сутнасці дапамагалі класаваму ворагу ў яго шкодніцкай рабоце.

Тое, што адбылося ў Прудокскім сельсавеце, не з'яўляецца выпадковасцю ў раёне. Перавыбары тут, за выключэннем асобных сельсоветаў (Тварычаўскі, Бабраняцкі і Баброўскі) як масавая палітычная кампанія не адчуваліся. Актыўнасць калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў у раёне ў сувязі з перавыбарамі не ўзнята на вышыню палітычных задач перавыбарчай кампаніі. Упаўнаважаныя РК і РВК па сельсоветах больш за ўсё займаюцца тэхнічнымі пытаннямі правядзення выбарчых сходаў, на палітычна-масавую работу вакол задач перавыбараў зварачаецца мала ўвагі. Раённая выбарчая камісія ўсю сваю работу па сутнасці звяла да выпрацоўкі каляндарнага плана правядзення перавыбараў па раёну. РК партыі таксама абмежаваўся толькі выпрацоўкай наказа новавыбраным дэпутатам. Як гэта не дзіўна, але выбарчая кампанія не ўзмацніла тэмпаў выканання важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

Р. ФРАЛОЎ.

Пастанова Цэнтральнай выбарчай камісіі пры прэзідыуме ЦВК БССР

па паведамленню рэдакцыі газеты „Звязда" аб грубым парушэнні совецкай дэмакратыі і выбарчага заканадаўства на выбарчым участку вёскі Загараны, Прудокскага сельсавета, Мазырскага раёна

Заслухаўшы паведамленне рэдакцыі газ. «Звязда», цэнтральная выбарчая камісія пры прэзідыуме ЦВК БССР адзначае, што на выбарчым участку вёскі Загараны, Прудокскага сельсавета, Мазырскага раёна, выбары праведзены з грубейшым парушэннем прынцыпаў совецкай дэмакратыі і інструкцыі аб выбарах у советы, якое (парушэнне) выявілася ў адсутнасці якой-бы там ні было палітмасавай работы сярод выбаршчыкаў, ігнараванні працоўных аднаасобнікаў, голым адміністраванні і дапушчэнні на выбарчы сход асоб, пазбаўленых выбарчага права.

Цэнтральная выбарчая камісія пастанаўляе:

1. Выбары па ўчастку вёскі Загараны, Прудокскага сельсавета, Мазырскага раёна, адмяніць.

2. За дапушчэнне грубага парушэння совецкай канструкцыі, выбарчага заканадаўства, прынцыпа совецкай дэмакратыі і голае адміністраванне—ВЫБАРЧУЮ КАМІСІЮ ПРУДОКСКАГА СЕЛЬСОВЕТА РАСПУСЦІЦЬ.

3. Указаць мазырскай раённай выбарчай камісіі, што паказаныя факты з'яўляюцца вынікам адсутнасці штодзённага канкрэтнага, аператыўнага кіраўніцтва выбарамі советаў раёна і што справаздачна-перавыбарчая кампанія не ўвязваецца з вырашэннем гаспадарча-палітычных задач.

4. Прапанаваць прэзідыуму мазырскага РВК і раённай выбарчай камісіі, тэрмінова вылучыць і зацвердзіць новы склад прудокскай сельскай выбарчай камісіі, забяспечыць шырокае разгортванне палітмасавай работы і правесці выбары пры актыўным пагалоўным удзеле ўсіх выбаршчыкаў як у Прудокскім, так і іншых сельсоветах раёна з суровым захаваннем совецкай канстытуцыі і выбарчага заканадаўства.

5. Даручыць раённай выбарчай камісіі, пад адказнасць тав. Жогава, тэрмінова разглядзець факты па рушэння выбарчага заканадаўства ў Прудокскім сельсавеце і прыцягнуць вінаватых да суровай адказнасці.

Аб выніках дапажыць цэнтральнай выбарчай камісіі ў трохдзённы тэрмін.

Старшыня Цэнтральнай Выбарчай Камісіі пры прэзідыуме ЦВК БССР М. ЛЯЎКОЎ.

13 лістапада 1934 г., г. Менск.

ХОД ВЫБАРАЎ У СЕЛЬСОВЕТЫ

Па частцы сельскіх советаў 37 раёнаў Беларусі на 13 лістапада ўжо выбрана 6041 новых членаў сельсоветаў, з іх 1563 жанчыны. Асноўная маса (78,7 проц.) новавыбраных членаў сельсавета — калгаснікі.

Актыўнасць выбаршчыкаў у справаздачна-выбарчай кампаніі дасягае 78,9 проц. мужчын і 73,2 проц. жанчын. У выбарах па паказаных советах прымала ўдзел 215.412 выбаршчыкаў.

Самая высокая актыўнасць яўкі на справаздачна-выбарчыя сходы па Аршанскаму раёну — 89,2 проц., Слуцкаму — 87,7 проц., Гарадоцкаму — 87,1 проц., Талачынскаму — 86 проц. і Сенненскаму — 85,9 проц.

Самая нізкая — па Бялыніцкаму —54,9 проц., Чэрвеньскаму — 62,4 проц., Терахоўскаму — 65,4 проц. і т. д.

38 раёнаў, у тым ліку Чачэрскі, Чавускі, Хойніцкі, Уваравіцкі, Старадарожскі, Пухавіцкі, Рагачоўскі і інш. яшчэ да гэтага часу не далі цэнтральнай выбарчай камісіі ніякіх вестак аб ходзе справаздачна-выбарчай кампаніі.

СХОДЫ ЗРЫВАЮЦЦА

СУРАЖ. Дрэнна арганізавана справаздачна-перавыбарчая кампанія па ўсяму раёну. Ёсць факты зрыву справаздачных сходаў па многіх сельсоветах.

Дрэнна арганізаваны справаздачныя сходы і па местачковаму совету. Процант яўкі выбаршчыкаў на сходы вельмі нізкі (50 проц.). Справаздачы носяць агульны характар.

У спрэчках выбаршчыкі адзначаюць, як недахоп работы совета—адсутнасць культурнамасавай работы. Культурнае абслутоўванне насельніцтва пастаўлена дрэнна. Вуліцы брудныя.

Старшыня местсовета Шаўроў не ведае зусім, што робіцца ў саматужна-прамысловых арцелях. Між тым, —указвалі выбаршчыкі, — прадукцыя, выпускаемая арцелямі, вельмі нізкай якасці, арцелі засмечаны чужымі элементамі. Местсовет гэтым не цікавіцца.

Яўка жанчын на справаздачныя сходы па раёну нізкая. Слабы ўдзел прымаюць у справаздачна-выбарчай кампаніі комсамол і піянерарганізацыі.

ХОД СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

на 10 лістапада

	БССР	Зах. вобл.
	(У ПРОЦАНТАХ)	
Здана ільнопрадукцыі	74,3	57,3
У тым ліку валакна сялянскай апрацоўкі	68,4	46,3
Трасты	82,7	83,5
Пянькі	32,9	30,0
Мясапастаўкі	78,6	—

ЗА РУБЯЖОМ

ІСПАНСКАЯ БУРЖУАЗІЯ НЕ ЎПЭЎНЕНА Ў ПЕРАМОЗЕ

Інтэрв'ю з Лідэрам іспанскіх соцыялістаў

ПАРЫЖ, 12 лістапада. (Інф. «Правды»). Іспанскі соцыялістычны лідэр, былы міністр фінансаў у першым рэспубліканскім ўрадзе Ідалесіо Прыетто (які ўцёк за Францыю пасля паражэння паўстанцкага руху) у гутарцы з вашым карэспандэнтам расказаў наступнае аб кастрычніцкіх падзеях:

«Урад,—заявіў ён,—вёў узмоцненае наступленне на рабочы клас, ліквідаваў адно за другім завяванні рабочых, ачышчаў прадпрыемствы ад рэвалюцыянераў. У такіх умовах рабочы клас добра сабе ўяўляў, што адзіным выхадам можа быць рэвалюцыйны шлях».

Ідалесіо Прыетто прызнае, што іменна пад націскам рабочых мас соцыялістычная партыя вымушана была пайсці на стварэнне рабочага альянса.

«Несумненна, — заявіў ён,—што паўстанне не было падрыхтавана ў той момант, калі яно пачалася, але нецярпенне рабочых мас не дапускала далейшага адтэрмінавання».

Крытыкуючы дзеянні арганізацыі адзінага фронта «альянса обрара», соцыялістычны лідэр не можа не прызнаць актыўнай ролі комуністычнай партыі ў барацьбе іспанскіх рабочых.

«Трэба аддаць належнае таварышам комуністам,—заявіў ён,—якія вялі сябе з агромнай мужнасцю. Гэтага нельга сказаць пра анархістаў. За выключэннем анархістаў у Хіхоне (Астурыя), дзе анархісцкая арганізацыя вяла барацьбу, анархісты ўсюды ўстрымліваліся ад удзелу ў паўстанні.

Гэта акалічнасць, а таксама пасіўнасць сельска-гаспадарчых раёнаў, прадвызначылі паражэнне паўстаўшых і локалізавалі барацьбу ў Астурыі і ў Біскаіі, дзе ў комуністаў ёсць моцныя базы.

Расказваючы аб дзікім тэроры контрэвалюцыі, Прыетто заявіў: «Урад мабілізаваў супроць нас нераўважна авіяцыю, флот і каланіяльную армію, бо войскі метраполіі аказаліся ненадзейнымі. І хоць буржуазія крычыць аб перамозе, яна сама да гэтага часу не верыць у яе».

НОВЫЯ СМЯРОТНЫЯ ПРЫГАВОРЫ Ў ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 12 лістапада. (БЕЛТА). З Іспаніі паведамляюць аб новых смяротных прыгаворах, вынесеных маракам, западзгроным у адносінах з паўстаўшымі рабочымі. Ваенным судом у Картахене прыгаворан, да смерці адзін матрос, а другі асуджан на 10 год турэмнага зняволення. Іншыя «мяцежныя» матросы і салдаты прыгавораны да турэмнага зняволення тэрмінам ад 8 да 2-х год.

РАБОЧЫЯ АУСТРЫІ ВЕРНЫ МАРКСІЗМУ

ВЕНА, 11 лістапада (БЕЛТА). Штарэмберг даў інтэрв'ю венскаму карэспандэнту венгерскай газеты, у якім прызнаў, што спробы прыцягнуць да фашызма аўстрыйскіх рабочых бескарысны. «Бессмысленна — сказаў Штарэмберг — угаварваць марксісцкіх рабочых, бо рабочыя нам не верацьць, намі пагарджаюць. Я сцвярджаю, што мы ніколі палітычна не прыцягнем на свой бок па-марксісцку настроеных рабочых мас».

КЛАС СУПРОЦЬ КЛАСА

МАГУТНЫЯ АНТЫФАШЫСЦКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 11 лістапада. (БЕЛТА) 11 лістапада, дзень гадавіны перамір'я, выліўся ў Парыжы ў сапраўдны агляд двух варожых лагераў: фашызма і антыфашысцкага фронта. У антыфашысцкай дэманстрацыі ўдзельнічалі 100 тыс. чалавек, у тым ліку 28 арганізацый былых франтавікоў розных палітычных напрамкаў, якія на заклік комуністычнай і соцыялістычнай партыі вышлі на вуліцу.

Франтавікі ішлі з лозунгамі: «Перагародзім дарогу фашызму», «Далоў надзвычайныя дэкрэты аб скарачэнні пенсій і дапамог былым франтавікам», «За адзінства дзеянняў», «Патрабуем роспуску і раззбраення фашысцкіх арганізацый», «Патрабуем вызвалення Тэльмана» і т. д.

За франтавікамі ішлі калоны салдацкіх удоў і сірат, рабочых арганізацый, пенсіянераў і т. д. Велізарныя натоўп, заняўшы тратуары па ўсім шляху дэманстрацыі ад плошчы Бастыліі да плошчы Насьон, віталі былых салдат. З вокан дамоў звісалі чырвоныя флагі і прывітальныя лозунгі. З натоўпу раздаваліся выгукі: «Салдаты з намі», спявалі «Інтэрнацыянал». Гэта дэманстрацыя сваімі размерамі зрабіла велізарнае ўражанне.

Велізарным кантрастам гэтай дэманстрацыі з'явілася выступленне фашыстаў каля трыумфальнай аркі. Фашысцкія арганізацыі «Агнёвыя крыжы», «Жэнес патрыёт» і «Сэн дэрыэ фрэнсэз», якія бярэцуць сваіх прыхільнікаў у пераважнай ліку з буржуазных сынкоў, дэфілявалі перад ваеннымі і грамадзянскімі ўладамі. У фашысцкай дэманстрацыі, згодна даных агенцтва Гавас, удзельнічала ўсяго 16 тыс. чалавек. Фашысцкая дэманстрацыя насіла характар ваеннага параду, праходзіла пад лозунгам — «Няхай жыве Думерг» і «Эрыо ў турму». Проста з дэманстрацыі фашысты накіраваліся к дому Думерга і на ладзілі пад вокнамі яго кватэры новую дэманстрацыю, на якую Думерг адказаў прывітаннямі. Думерг прыняў кіраўніка арганізацыі «Агнёвыя крыжы» палк. дэ-ла-Рока а таксама прадаўжоў іншых фашысцкіх арганізацый, з якімі мецдоўгую гутарку. Пры гутарцы пры сутнічаў міністр авіяцыі генерал Дэнен.

***

ПАРЫЖ 11 лістапада. (БЕЛТА) Антыфашысцкія дэманстрацыі былых франтавікоў паміма Парыжа адбыліся таксама ў радзе іншых гарадоў Францыі. Найбольш магутная дэманстрацыя адбылася ў Ліёне, сабраўшая 60 тыс. чалавек. У чаго дэманстрацыі было некалькі сутычак з фашыстамі, у якіх было ранена 5 чалавек.

На мітынгу, які адбыўся пасля дэманстрацыі, выступіў ад компартыі т. Кашэн, які заявіў, што ўсе за адзіным фронтам барацьбы нас тупным этапам павінна з'явіцца адзінства прафесіянальнага руху.

Па Саюзу і Совецкай Беларусі

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ АТРЫМАЛА КУЗНЮ ЗДАРОЎ'Я

АДКРЫТ САНАТОРЫЙ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

СОЧЫ, 15 лістапада. (БЕЛТА). Учора адбылося ўрачыстае адкрыццё санаторыя імя Варашылава. Пабудаваны на 10-процантнае адлічэнне ад дзяржаўных пазык, распаўсюджаных у часцях Чырвонай арміі, санаторый з'яўляецца грандыёзнейшым лячэбным і культурным камбінатам, разлічаным на абслугоўванне на працягу года 6 тысяч чалавек. Карпусы яго адзіўляюць выключным блескам аддзелкі і камфортам абстаноўкі. Усё абсталяванне, уключаючы найскладанейшую медыцынскую апаратуру, створана на совецкіх заводах. Ужо за першыя пяць месяцаў эксплаатацыі санаторый заваяваў выключныя сімпатыі камандзіраў і байцоў РСЧА.

У атрыманым спецыяльным загадзе тав. Варашылава гаворыцца: «Чырвоная армія атрымала вялікую найлепш здобленую кузню здароўя, здольную штогод добра абслужыць тысячы камандзіраў і палітработнікаў. Ад імя РСЧА аб'яўляю падзяку ўсяму калектыву будаўнікоў, які многа і грунтоўна, з вялікім энтузіязмам папрацаваў на гэтай вельмі патрэбнай арміі будоўлі».

Лепшыя ўдарнікі будоўлі ўзнагароджаны каштоўнымі падарункамі.

ПАНАРАМА ПЕРАКОПА

Ідэя стварэння пры ЦВК СССР камісіі па ахове, аднаўленню і стварэнню помнікаў грамадзянскай вайны і Чырвонай арміі належыць наркому абароны тав. К. Е. Варашылаву. Ім-жа было падказана першае творчае задание камісіі — стварэнне панарамы Перакопа.

10 лістапада ва «Всекохудожнике» адбылася першая аб'яднаная нарада па пытанню аб стварэнні панарамы Перакопа.

Перакопская эпапея—гэта сума на маганняў Чырвонай арміі ў апошні перыяд грамадзянскай вайны. Задача панарамы—прадставіць увесь комплекс падзей, якія завяршыліся ўцяканнем разгромленых белых часцей.

Гэтымі днямі ў Крым выязджае творчая брыгада мастакоў з работнікамі ваенна-гістарычнай кафедры Ваеннай акадэміі імя Фрунзе.

На аснове гэтай падрыхтоўкі і серыі эцюдаў, якія імі будуць зроблены ў Крыме на працягу лістапада-пачатку снежня — у той час года, калі падзеі перакопскай эпапеі адбываліся 15 год таму назад, — мастакі прыступяць да распрацоўкі рабочага эскіза панарамы. Тэрмін прадстаўлення рабочага эскіза —лета 1935 года.

(«Рабочая Москва»).



Дзіцячыя яслі ў калгасе 1-я Конная, Менскага раёна. Яслі адкрыты, як результат выканання сельсоветам наказу сваіх выбаршчыкаў.

Электрычнасць, кіно і радыё

ЛЁЗНА, 13. Завяршыўшы з поспехам асноўныя сельска-гаспадарчыя кампаніі, калгаснікі Лёзненшчыны пераключаюцца на культурнае будаўніцтва.

Пры дапамозе калгасаў і калгаснікаў абсталёван раённы 30-ватны радыёвузел.

У Лёзне пабудавана гукавое кіно на 400 месц. На вуліцах мястэчка ўстаноўлены электрычныя ліхтары.

ЛЁЗНЕНСКІ РАЁН АТРЫМАЎ САМАЛЁТ

Лёзненскаму раёну перадан самалёт «Калгаснік Лёзненшчыны», пабудаваны па сродкі, сабраныя сярод калгаснікаў і рабочых соўтасаў.

Пасля ўрачыстага мітынга, прысвечанага перадачы самалёта, адбыліся палёты лепшых ударнікаў-калгаснікаў і рабочых. Першым лятаў т. Цімошын з соўтаса «Адаменкі», сабраўшага на пабудову самал

ГАНЕБНАЯ ПЯЦІДНЕУКА

ЯНА ДАЛА ТОЛЬКІ 3 ПРОЦ. ПРЫРОСТУ. СПРАВА ГОНАРА КОЖНАГА РАЁНА, КОЖНАГА СЕЛЬСОВЕТА І КАЛГАСА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ІЛЬНОЗАГАТОВАК ДА 20 ЛІСТАПАДА

Гнілыя лібералы

(АД БЕЛАРУСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА «ПРАВДЫ»).

У Беларускай акадэміі навук працвітаюць своеасаблівыя погляды на гасціннасць. Ветліва даючы трыбуну акадэміі для дакладу, нават не ведаючы дакладчыка. Не знаёмячыся з тэзісамі дакладу, лічачы гэта лішняй цікаўнасцю. І знехоўзяцца лоўкіх спраў майстры, якія карыстаюцца залішняй даверлівасцю некаторых акадэмікаў.

З'явіўся нядаўна ў адзін з габінетаў Беларускай акадэміі навук акадэмік Прохараў, назваў сябе прафесарам музыкі і прапанаваў свае паслугі прачытаць даклад «Аб народнай песні» ў інстытуце гісторыі. Прапанову прынялі з вялікай ахвотай.

22 кастрычніка адбыўся даклад акадэміка і асп[illegible]іранты — комуністы і комсамольцы — пачулі тэорыю аб апалітычнасці музыкі, аб тым, што «музыка — катэгорыя надкласавая». Далей дакладчык стаў «тэарэтызаваць» па нацыянальнаму пытанню: «руская песня мае перавагі перад усімі песнямі», «манголам нікопі не ўдасца ваяваць з расійцамі». Свой антысавецкі даклад Прохараў закончыў выражэннем спачування аднаму з лідэраў буржуазнага нацыяналізму ў Беларусі — Баліцкаму.

Прысутнічалі на гэтым дакладзе комуністы Меляшкевіч, Араноўіч, Жукоўскі, Галубок і інш. Выслухалі даклад, злёгку крытыкнулі дакладчыка. А потым, як вядзецца, Прохараў узяў заключнае слова.

І тут тэарэтык надкласавай музыкі і песні, ужо не саромячыся, адкрыў твар чорнасоценца:

«Я не марксіст, — заявіў ён, — я ніколі не быў і не хачу быць. Я служу музыцы, я — музыкант. Была ўлада царская, зараз совецкая, прыдзе яшчэ якая-небудзь, а музыка вечна. Людзі, уладу маючыя, і цяпер тармозяць развіццё музыкі, не разумеючы яе».

Комуністы сядзелі, уважліва слухалі, не перабівалі дакладчыка, свяцілі захоўвалі ўстаноўленыя ў акадэміі правілы гасціннасці. І, як ні дзіўна, праз некалькі дзён партыйны камітэт акадэміі, абмяркоўваючы сумны інцыдэнт, выносіць такое рашэнне: «выступаўшыя ў прэчках па дакладу т.т. Меляшкевіч, Галубок, Араноўіч і інш. далі рашучы адпор чорнасоценцу Прохараву, выкрыўшы яго, як клясавага ворага. Адначасова з тым партком асабліва падкрэслівае... недапушчальнасць паводзін прысутных на нарадзе комуністаў і комсамольцаў т.т. Меляшкевіч, Араноўіч, Жукоўскі, Галубок, Ляпіч, Махнач і інш.), якія выразіліся ў тым, што далі магчымасць Прохараву выступіць з заключным словам, што партком лічыць, як гнілы лібералізм да клясава-варожых элементаў і прыпушчэння клясовай пільнасці».

Выходзіць, што адны і тыя-ж комуністы — Галубок, Араноўіч, Меляшкевіч — і далі рашучы адпор, і праявілі гнілы лібералізм! Лепшага не выдумаеш!

* *

У сцены Беларускай акадэміі навук за апошні час не раз прабавалі пранікнуць буржуазныя нацыяналісты. Даволі ўспомніць контррэволюцыйную дзейнасць Ігнатоўскага, некалькі пазней Мятлы, Рака-Міхайлоўскага і іншых агентаў фашызма. На жаль, гэтыя ўрокі прайшлі дарма. Большэвіцкая пільнасць у партыйнай арганізацыі Беларускай акадэміі навук яшчэ не на вышыні.

Ф. ВІГДАРОВІЧ.
(«ПРАВДА»).

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

Камісія канстатуе, што за мінулую пяцідзённку па БССР рэзка знізіліся тэмпы як па ільнозагатоўках, так і па хлебазакупках. Адзначыць, што па хлебазакупках толькі адзін Менскі раён у апошнюю пяцідзённку дабіўся значнага эруху, прадаў дзяржаве 127 тон, але тэмпы мясапаставак па гэтаму раёну працягваюць заставацца нездавальняючымі.

Сцяг ЦК і СНК пакінуць за МЕНСКІМ раёнам. Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць з папярэджаннем аб неабходнасці ліквідаваць адставанне, АСІПАВІЦКІ раён, КАСЦЮКОВІЦКІ—у другі раз па мясапастаўках і здачы пянькі, ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ—па мясапастаўках, ПРАПОЙСКІ—у другі раз па мясапастаўках і АРШАНСКІ—У АПОШНІ раз па хлебазакупках і мясапастаўках.

За нездавальняючыя тэмпы ільнозагатовак (прырост за апошнюю пяцідзённку 1,2 проц.), мясапаставак (прырост 0,1 проц.) і хлебазакупак (не закуплена ні адной тоны) зняць з чырвонай дошкі і выключыць з ліку кандыдатаў на атрыманне чырвонага сцяга ВІЦЕБСКІ раён.

Сцяг ЦК і СНК па ільнаводчай зоне пакінуць за СЕННЕНСКІМ раёнам, але ў апошні раз папярэдзіць яго аб тым, што калі ў бліжэйшую пяцідзённку не будзе ліквідавана адставанне ў хлебазакупках, раён будзе пазбаўлен пераходнага сцяга і знят з чырвонай дошкі.

За нездавальняючы прырост у выкананні ільнозагатовак і паставак за апошнюю пяцідзённку па ДРЫСЕНСКАМУ (здача ільну—0,9 проц., мясапаставак—0,7, закуплена хлеба ўсяго 6 тон) і БЕШАНКОВІЦКАМУ (ільнездача—2,8 проц., мясапастаўкі —0,1, закупка хлеба—4 тоны) раённая камісія пастанаўляе ЗНЯЦЬ ГЭТЫЯ РАЁНЫ З ЧЫРВОНАЙ ДОШКІ І ВЫКЛЮЧЫЦЬ З ЛІКУ КАНДЫДАТАЎ НА АТРЫМАННЕ ПЕРАХОДНАГА СЦЯГА. Адзначыць, што ні адзін ільнаводчы раён па тэмпах ільнозагатовак і інш. паставак не можа быць занесен кандыдатам на атрыманне сцяга.

Пераходны сцяг палітсектара МТС НКЗБ заставіць у АРШАНСКАЯ МТС. Кандыдатамі на атрыманне сцяга лічыць КАСЦЮКОВІЦКУЮ і ТАНЕЖЫЦКУЮ МТС.

За недапушчальнае адставанне ў выкананні планаў ільнозагатовак, мясапаставак і адставанне ў хлебазакупках, камісія пакідае на чорнай дошцы МАГІЛЕЎСКІ, ДУБРОВЕНСКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, КАРМЯНСКІ, РАГАЧОЎСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, НАРАЎЛЯНСКІ і ПЕТРЫКОЎСКІ раёны.

Дадаткова занесці на чорную дошку за абсалютна нездавальняючыя тэмпы ільнозагатовак МСЦІСЛАЎСКІ і ЧАВУСКІ раёны.

Кандыдатамі на чорную дошку пакінуць БРАГІНСКІ, ЧЭРВЕНЬСКІ раёны і дадаткова занесці ХОЙНІЦКІ і ЕЛЬСКІ раёны.

Камісія папярэджвае кіраўніцтва РЭЧЫЦКАГА, БЫХАЎСКАГА, ЛАГОЙСКАГА, ПУХАВІЦКАГА і КЛІМАВІЦКАГА раёнаў аб тым, што калі яны не ліквідуюць адставанне па ільнозагатоўках, мясапастаўках і хлебазакупках, яны будуць залічаны кандыдатамі на чорную дошку.

ХОД ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ, ПЯНЬКІ, МЯСАПАСТАВАК І ЗАСЫПКІ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ ПА БССР НА 10 ЛІСТАПАДА 1934 ГОДА

РАЁНЫ	Здана: Ільнопрадукцыі	Пяньку	Трасты	Пянькі	Выкананне плана мясапаставак	Засыпана насенне фондаў: Зерневыя	Бульба
Асіпавіцкі	106,0	106,0	—	62,9	83,9	64,2	66,8
Менскі	103,7	103,7	—	100,7	79,9	38,6	171,6
Сенненскі	101,6	108,1	100,9	9,7	82,2	28,8	81,6
Касцюковіцкі	100,3	99,5	102,0	14,6	70,1	47,2	48,4
Чырв.-Слаб.	100,3	100,2	—	88,9	78,9	57,5	144,0
Аршанскі	100,0	100,9	96,8	53,5	78,8	82,6	107,5
Прапойскі	98,7	98,7	—	8,6	78,0	62,0	93,1
Любаньскі	93,6	93,6	—	40,2	98,8	73,2	106,1
Дрысенскі	92,9	78,0	93,7	—	90,8	42,6	95,4
Полацкі	92,2	84,3	98,6	15,6	79,9	47,9	56,2
Асвейскі	92,0	79,6	96,6	—	86,9	37,7	89,2
Віцебскі	89,4	89,4	—	—	80,5	52,3	94,7
Бешанковіцкі	89,0	90,3	88,1	50,6	75,7	64,0	87,6
Старобінскі	87,8	87,8	—	9,3	89,7	61,6	103,4
Смаляніцкі	87,7	87,7	—	97,5	79,6	39,4	100,4
Сіроцінскі	87,3	157,5	73,7	—	81,0	49,2	101,7
Лёзненскі	86,6	73,4	94,4	5,6	79,6	33,0	64,9
Чашніцкі	85,0	75,2	95,9	9,2	78,5	41,3	99,4
Бягомльскі	84,6	84,6	—	68,4	76,8	84,6	101,4
Камарынскі	81,8	81,8	—	68,7	90,5	12,6	25,3
Слуцкі	81,6	81,6	—	19,3	86,0	64,3	112,7
Суражскі	81,6	112,1	69,5	21,7	87,9	73,5	93,7
Лепельскі	80,3	68,8	86,4	4,7	75,9	38,3	80,9
Бальшыніцкі	79,5	79,5	—	89,6	77,6	104,6	122,9
Веткаўскі	78,2	78,2	—	14,7	68,4	62,9	99,2
Уздзенскі	78,2	78,2	—	56,0	86,9	46,9	101,5
Талачынскі	77,7	77,7	77,6	10,6	71,9	44,2	60,4
Старадарожскі	77,5	77,5	—	24,7	86,5	7,9	16,0
Буда-Кашалёўскі	75,8	75,8	—	23,8	66,3	136,4	123,4
Крычаўскі	74,6	66,6	80,2	6,6	77,1	37,6	107,1
Плешчаніцкі	74,0	74,0	—	59,4	66,1	38,0	—
Шклоўскі	73,6	64,2	84,0	9,8	78,9	27,0	56,0
Клічаўскі	73,4	78,4	—	93,0	69,1	49,4	129,6
Ушацкі	73,0	48,1	101,0	17,0	79,3	38,2	118,4
Крупскі	72,9	62,2	81,3	48,5	71,5	74,0	104,4
Бярэзінскі	72,8	72,8	—	88,8	78,4	48,3	77,0
Жлобінскі	72,2	72,2	—	40,9	77,4	67,8	99,1
Жыткавіцкі	71,9	71,9	—	47,6	85,7	35,7	62,8
Лоеўскі	71,9	71,9	—	78,3	83,5	73,7	109,6
Капыльскі	71,8	71,8	—	19,0	81,8	32,0	90,0
Расонскі	71,7	57,9	73,7	40,0	89,2	43,7	56,1
Глускі	70,3	70,3	—	55,0	77,0	70,0	114,6
Тураўскі	70,2	70,2	—	82,0	85,7	84,1	127,8
Дзяржынскі	69,7	69,7	—	25,0	78,2	20,1	98,5
Уваравіцкі	68,9	70,9	67,0	5,0	80,6	29,9	43,8
Чэрыкаўскі	68,5	68,5	—	19,8	80,2	48,0	108,2
Церахаўскі	67,9	69,4	65,7	47,6	75,7	82,5	66,6
Гарадоцкі	67,8	55,3	82,3	12,5	79,4	81,9	108,7
Заслаўскі	67,6	67,6	—	18,0	80,8	21,8	107,1
Чаўскі	67,1	67,1	—	20,3	82,8	52,1	66
Мазырскі	67,0	67,0	—	73,7	81,2	61,7	101,2
Гомельскі	66,7	66,7	—	14,0	73,8	73,7	122,8
Барысаўскі	65,8	65,8	—	110,9	73,1	82,7	65,6
Парыцкі	64,5	64,5	—	26,4	82,5	52,9	83,1
Горацкі	64,2	47,7	57,0	8,3	85,3	51,1	80,6
Бабруйскі	63,8	24,5	14,8	24,3	88,8	29,5	49,6
Чэрвеньскі	63,3	63,3	—	87,5	68,8	83,9	129,3
Клімавіцкі	62,7	62,7	—	9,8	75,9	56,2	98,9
Пухавіцкі	62,2	32,0	102,2	12,1	77,3	55,3	94,9
Лагойскі	60,8	60,8	—	51,0	77,7	35,5	144,4
Быхаўскі	59,6	59,6	—	35,7	81,2	51,3	95,6
Рэчыцкі	58,9	58,9	—	83,4	79,0	31,4	38,5
Ельскі	57,4	57,4	—	45,2	84,8	25,4	33,9
Петрыкоўскі	57,1	57,1	—	60,9	81,7	74,1	99,9
Чавускі	56,3	63,1	48,8	20,4	76,4	61,5	134,5
Хойніцкі	54,8	54,8	—	27,8	80,4	65,8	107,5
Брагінскі	54,8	54,8	—	54,0	85,7	32,6	68,3
Мсціслаўскі	54,7	31,9	76,7	2,6	71,8	28,3	97,4
Лельчыцкі	54,0	54,0	—	63,5	75,5	57,5	120,2
Магілеўскі	52,3	48,[illegible]	57,8	8,0	66,7	54,1	80,5
Рагачоўскі	50,5	41,4	64,2	21,8	78,3	14,1	13,7
Нараўлянскі	47,9	47,9	—	56,6	81,5	45,4	59,2
Чырвонапольскі	45,8	20,0	71,7	7,3	67,3	44,1	64,7
Кармянскі	43,1	29,5	60,9	14,3	79,2	11,2	—
Дубровенскі	35,1	35,1	—	0,8	74,4	70,1	131,7
РАЗАМ ПА БССР	74,3	68,4	82,7	32,9	78,6	50,4	86,8

Чорная дошка

За зрыў выканання планаў пераапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі і іншых паставак дзяржаве заносяцца на чорную дошку:

МАГІЛЕЎСКІ раён (сакратар РК Рэвінскі, старшыня РВК Пушчын);

ДУБРОВЕНСКІ раён (сакратар РК Мышалаў, старшыня РВК Мацько);

ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ раён (сакратар РК Лапацёў, старшыня РВК Дупанаў);

КАРМЯНСКІ раён (сакратар РК Саладухін, старшыня РВК Грыбаедаў);

РАГАЧОЎСКІ раён (сакратар РК Геўрасёў, старшыня РВК Зялёнка);

ЛЕЛЬЧЫЦКІ раён (сакратар РК Асінскі, старшыня РВК Гаўрусёў);

НАРАЎЛЯНСКІ раён (сакратар РК Кагачонак, старшыня РВК Элькін);

ПЕТРЫКОЎСКІ раён (сакратар РК Арашчук, старшыня РВК Град).

МСЦІСЛАЎСКІ раён (сакратар РК Штэйнгарт, старшыня РВК Рай);

ЧАВУСКІ раён (сакратар РК Кулікаў, старшыня РВК Буры);

Чырвоная дошка

Пастановай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносяцца на чырвоную дошку:

МЕНСКІ раён (сакратар ГК Рыскін, старшыня РВК Турэцкі);

СЕННЕНСКІ раён (сакратар РК Кац, старшыня РВК Качук);

АСІПАВІЦКІ раён (сакратар РК Фельдман, старшыня РВК Караленка);

КАСЦЮКОВІЦКІ раён (сакратар РК Лісковіч, старшыня РВК Грэбеньчык);

ЧЫРВОНА-СЛАБОДСКІ раён (сакратар РК Бурдзілаў, старшыня РВК Уткін);

АРШАНСКІ раён (сакратар РК Соскін, старшыня РВК Міцькоў);

ПРАПОЙСКІ раён (сакратар РК Кавалёў, старшыня РВК Чорнабродаў).

КАЛІ У ЧАВУСАХ ПЕРАСТАНУЦЬ ЗАКЛІНАЦЬ І БАЛБАТАЦЬ?

Калгас імя Дзержынскага (Доўгамоскі сельсавет) зацягваў пераапрацоўку і здачу ільновалакна. Пявыходзы на работу, нізкая прадукцыйнасць працы былі асноўнымі прычынамі адставання калгаса. 105 калгаснік апрацоўвалі у дзень усяго 115 кгр. ільновалакна. Праўленне калгаса прымала розныя меры: выносіла вымовы з ганьбаваннем, штрафавала. Але ўсё не дапамагала. Нарэшце, па [illegible] перадавых калгаснік была арганізавана выдача хлеба на ільнаныя працадні. Калгас вылучыў прэміяльны фонд. Пачалі штодзённа прэміраваць лепшых трапальшчыц і сартоўшчыц. І работа пашла зусім інакш. Спынілася нявыхады і спазненні. Замест 9-10 гадзін на работу пачалі выходзіць досвіткам. Замест ранейшых 115 кгр. гэта-ж колькасць калгаснік пачала апрацоўваць 450.

Можна было падумаць, што кіраўнікі Чавускага раёна, пераканаўшыся ў рашаючай ролі хлебных авансаў і выдачы прэмій за лепшую апрацоўку ільну, неадкладна перанясуць гэты вопыт ва ўсе калгасы раёна. Але нічога падобнага не здарылася.

У Чавусах лічаць найлепшым і адзіна правільным метадам ліквідаваць сваё адставанне — гэта прынясць яшчэ адну рэзалюцыю, «моцна» пагутарыць па тэлефону са старшынёй таго ці іншага сельсовета, дабіцца ад яго абяцання неадкладна ліквідаваць прарыў і т. д., у крайнім выпадку—«падкінуць» яшчэ аднаго ўпаўнаважанага. Зрабіўшы гэту нескладаную справу, у раёне з упэўненасцю ў перамозе чакаюць чарговай зводкі. А зводка з пяцідзённі ў пяцідзённку падвозіць кіраўніцтва раёна. Быў раён на [illegible] месцы ў рэспубліцы, скаціўся на 16-е потым на 29-е, нарэшце на 39-е і т. д.

Аказваецца, што нават найбольш выпрабаваны метад — пасылка ўпаўнаважаных без большэвіцкай арганізацыі справы не дапамагае.

Напрыклад, у Амхініцкім сельсавеце па думцы сакратара РК КП(б)Б адзін з лепшых упаўнаважаных тав. Турчыкаў, а план ільнозагатовак па гэтаму сельсавету выканан усяго на 9 проц.

— Што я магу зрабіць?—скардзіцца т. Турчыкаў. — Склікаў нараду, сказаў, каб мабілізаваліся, каб арганізавалі чырвоны абоз. Не пярэчылі, абяцалі. Я быў улэўнен, што выканаюць. Але падзялі, нічога не вышла.

Спачуваем тав. Турчыкаву. Кругом яго падводзяць. Вось у калгасе імя М. Горкага са 120 працаздольных калгаснікаў на ільне працуе толькі 20.

— Што я магу з імі зрабіць — скардзіцца [illegible] Турчыкаў. — Знаходзяць розныя прычыны, а на апрацоўку ільну не ідуць.

Але варта было пагаварыць 10-15 мінут з калгаснікамі аб налічэнні двух працадзён за выкананне дзённай нормы, аб выдачы авансу хлеба і алею на ільнаную працадні, як на заўтра ўсе 60 калгаснік выйшлі на апрацоўку ільну. Старшыня калгаса нават перапалохаўся і прыбег са скаргай, што ніхто з калгаснік не хоча кінуць пераапрацоўку ільну і ісці на іншыя работы.

Ці можна сумнявацца ў правільнасці слоў ударніцы калгаса «Новае жыццё», Гарбачэнкі Наталі, што «калі-б у нас правільна налічвалі працадні і выдавалі авансы хлеба за апрацоўку ільну, мы-б дзень і ноч працавалі, але аб усім гэтым перцы пяз чуен»?

ГРЫНГЛАЗ.

УРЭЦКАЯ УЗОРНАЯ

АД АДНАГО НАСТАЎНІКА ДА ТРЫЦЦАЦІ ШАСЦІ

Некалькі гістарычных даведак аб школе, аб яе мінулым, даўнім і нядаўнім. Пару слоў аб тых часах, калі пладзіліся яшчэ прыставы і граднікі ды іншыя «гаспадзіны начальнікі». Была і тады школа. І настаўнік быў. І сорак вучняў было. І вучыліся. Маладыя чытачы не ведаюць ранейшай вучобы, а таму не грэх і успомніць.

Вось стаіць хлапчынё і дрыжыць перад сталом гаспадзіна настаўніка, нерашуча складае вялікія літары.

— Буки-аз, что будет, дурак? — дыктуе пан вучыцель.

— Б-б-б-а...—нерашуча цягне хлапец, скоса пазіраючы на кляновую лінейку.

— А люди-добро-аз?

— Лда...

— А вместе?

— Балда...

— А что такое балда?

— Не могу знать, господин учитель... — і малы загадае адхіляецца ад грознай лінейкі.

— Ну, раз не знаеш, значит ты и есть балда... Садись, дурак...

Адным словам, вучылі...

Поп прамудрасці божай: пра райскія прыгоды Адама і Евы, пра спакушэнне Восіпа, пра п'янства Ноя, які пасля морскіх вандраванняў так разбэсціўся, што не саромеўся скідваць апошнія часткі свайго туалета; пра хрыстовы самагонныя прыкмечванні ў Кане галілейскай... «Верую», канешне, і «ойча наш» і «благадарную деву»...

Вучылі...

З геаграфіі пра хахлоў, самаедаў, калтуны і іншыя прамудрасці.

З гісторыі аб слаўных памазанніках божых, пра веру, цара і айчыну і пра той «жывот», які трэба за іх «положити» супроць ворага і супастата: унутранага і знешняга.

З арыфметыкі—пра няхітрыя спосабы абдурыць пакупца («и смешал купец два вина, и получал столько-то и столько-та прибыли»).

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ

Не горш своеасаблівага метада практаванняў...

Багата чаму вучылі... І асіліўшы ўсю гэту прамудрасць, чалавек ледзь-ледзь мог накрэмзаць сваё імя і прозвішча на афіцыяльных паперах расійскай імперыі ды часам згораць немудрашчы ліст да жонкі з салдатаў: «... и ящчэ кланяицца вам з унижаючым паклонам...».

Можна сказаць і аб нядаўніх гадах, калі ў працэсе ломкі дарэвалюцыйнай школы некаторыя ляваццкія пражэкцёры нарабілі шмат памылак і перагібаў, паставіўшы школы пад вялікую небяспеку, нарабіўшы багата шкоды падрастаючаму пакаленню. Але гэтыя былыя памылкі нашай школьнай сістэмы ўсім вядомы, і гаварыць аб іх не прыходзіцца.

Мы аб сённешнім дні Урэцкай школы. Прывядзем невялічкую статыстыку. Калі ў царскай Урэцкай школе, адзінай на тэрыторыі цяперашняга Урэцкага сельсавета, быў адзін настаўнік і сорак вучняў, дык цяпер у адной Урэцкай школе дзевятнаццаць настаўнікаў (у хуткім часе будзе дваццаць адзін) і 614 вучняў. Дадайце да гэтых лічбаў дзесяць настаўнікаў Урэцкай яўрэйскай школы ды пяць настаўнікаў пачатковых школ сельсавета—і мы ўбачым рост школьнай сеткі тэрыторыі Урэчча з аднаго настаўніка і сарака вучняў да трыццаці шасці настаўнікаў і 1.053 вучняў.

Да 1930 года школа лічылася пачатковай, мела чатыры камплекты, было 160 вучняў. З 1930 года школа становіцца семігодкай, а на сённешні дзень яна ўжо сярэдняя школа, мае восьмы клас, у будучым годзе будзе мець дзевяты. Разам з паралельнымі школа мае цэлых шаснаццаць класаў. Гэта своеасаблівы, калі хочаце, універсітэцкі гарадок—за ліку вучняў па колькасці будынкаў. Калісці школа зусім не мела свайго памяшкання. Да Окцябрскіх свят 1931 года было пабудавана вялікае спецыяльнае памяшканне. На другі год была пабудавана школьная сталоўка. За апошнія гады—яшчэ два будынкі.

У школе калісці не было ні бібліятэкі, ні добрага інвентара, ні патрэбных наглядных дапаможнікаў. Цяпер ёсць фізічны кабінет з абсталяваннем тысяч на шэсць рублёў. Ёсць хімічны кабінет. Мастацкай і вучэбнай літаратуры—тысяч на шэсць. Ёсць спецыяльная майстэрня з токарнымі і свідравальнымі варштатамі па металу і дрэву, з рознымі ціскамі і іншымі інструментамі; сваё кіно і свой радыёвузел. Школа мяркуе дастаць добры ўсіліцель і пашырыць свой радыёвузел на местачковы калгас. У хуткім часе ў школе будзе электрычнае асвятленне (гэта ўжо заслуга шэфа—броварнага завода).

У школьнай гаспадарцы—ёсць коні і каровы. Са школьнага шасцігектарнага ўчастка зямлі атрымана ў гэтым годзе 3.000 пудоў бульбы. 100 пудоў пшаніцы, 100 пудоў ячменю, чатырыста пудоў гародніны. Гэта немалая падмога для школьнай сталоўкі, дзе настаўнік атрымлівае абед за рубля і за поўрубля—вучань. У гэтай-жа сталовай вучань плаціць за снеданне пятнаццаць капеек.

Але не гэтым усім вызначаецца твар школы, яе асаблівасці, яе ўзорнасць. Гэта толькі дэталі, важныя, зразумела, але не асноўныя.

ПАБУДЗЕМ У КЛАСЕ

Пойдзем лепш у клас. Зойдзем у самы старэйшы, у восьмы. Першае, што кідаецца ў вочы свежаму чалавеку, які даўно не бываў у школе, гэта добрая дысцыпліна ў лепшым сэнсе гэтага слова. Гэта не калішняя вабітасць, запуджанасць дарэвалюцыйнага школьніка, які чакае заўсёды напасці, падвоху, езуіцкага запытання настаўніка, грамавых распяканак усялякіх інспектароў і да т. п. і быў часам цішэй вады і ніжэй травы. Гэта — цёплая таварыская атмасфера паміж вучнямі і настаўнікам павагада настаўніка, узаемная ўважлівасць, разуменне асноў калектыўнай дысцыпліны. У класе няма таго бязладнага гоману, які можна было напаткаць у нашых школах у нядаўныя пераўнальна гады. Адчуваеш, як удумліва, асяроджана працуюць вучні.

Школьны радыёвузел.

Вы на лекцыі граматыкі рускай мовы. Ідзе дыктант. Вы заглядваеце ў вучнёўскія сшыткі і вас самым сапраўдным чынам адзіўляе выключная чыстата і акуратнасць работы. Чысценькія сшыткі, у большасці дзяўчат яны аздоблены яшчэ адмысловымі вокладкамі. Старанна зроблены надпісы на сшытках. Акуратныя палі на старонках, роўнае без крывулек і памарак пісьмо, у многіх добры каліграфічны почарк. Да рэчы, каліграфія. З ёю не так даўно проста смяяліся. Навошта, маўляў, нам каліграфія, і без яе абыйдземся, гэта буржуазныя перажыткі, як скажам, чысты каўнерык або галштук і інш. І да т. п. І пісаў часам вучань так, што, напісаўшы, сам не мог разабраць свае іероглифы. І вось перад вамі чыста і акуратна напісаныя старонкі харошым такім і прыгожым почаркам. І ў школьным карыдоры вы бачыце спецыяльныя табліцы з узорамі пісьма для кожнага класа, для кожнае групы дзяцей, пачынаючы ад самых маленькіх і канчаючы падросткамі восьмага класа.

Вы на лекцыі беларускай літаратуры ў 5-м класе. Вучні чытаюць у перакладзе апавяданне Серафімовіча «Стрэлачнік». Чытаюць бойка, паравальна добра разбіраюцца ў змесце апавядання, у сэнсе паасобных сцэн, даволі ўдала аналізуюць асноўныя ідэі твору, творчыя замыслы аўтара. Праўда, трэба сказаць, што разбор твору трохі аднабокі, асноўная ўвага сканцэнтравана на социялістычнай вартасці твора. Трохі сухаваты, трафаретны і, скажу-бы, заліпне акадэмічны задаваемыя пытанні і адказы на іх спецыяльна фармулюемыя і запісваемыя на дошцы для ўсяго класа. Хацелася-б больш тэмпераменту, больш размаху, больш самой літаратуры на лекцыі літаратуры. Але тут вінават не настаўнік, а хрэстаматыя, абмежаваўшая аналіз твора пэўным трафарэтам, і прытым аднабокім. Багатая мастацкая спецыфіка твора, гэты магутнейшы сродак эстэтычнага выхавання вучня, застаецца па-за ўвагай. Вучань ведае ідэі апавядання, але бадай зусім не ведае тых мастацкіх сродкаў, праз якія гэтыя ідэі выяўлены. І нам адаецца, што выкладчыкам літаратуры не трэба баяцца часцей выходзіць за рамкі хрэстаматычных трафарэтаў, рабіць больш экскурсаў да мастацкіх вобразаў твора, да безмежных багацтваў яго мастацкай спецыфікі. Толькі ўсебаковым аналізам твора можна прыхіліць вучня да мастацкага слова, наогул да кнігі, прывучыць яго працаваць над кнігай і любіць яе.

Адная, мы крыху ўхіліліся ад самой школы. Прайдзіце па ўсіх яе класах, пабудзьце на ўсіх яе ўроках — і вы ўсюды заўважыце, адчуеце такую бадзёрую, радасную прыўзнятасць школьнай атмасферы.

Вось сядзіць невялікі такі сінявокі грамадзянін нашай рэспублікі. Яму сем год. Ён старанна марщчыніць лоб, аж сапе, небарака, вырашаючы мудрую задачу, а як-жа падзяліць восем яблык на чатыры чалавекі. І спытак перад ім — чысты і акуратны. І дагледжаны ў грамадзяніна вушы, у парадку пос, падстрыжаны валасы, аб яго абуткуу таксама клапоцяцца і школа і грамадскасць. Невялікі грамадзянін сядзіць на акуратнай, падагнанай пад яго рост, лаўцы. Пад ім выключна чыстая падлога, навакол белыя сцены, багата святла, паветра.

Пасля трох урокаў сінявокі грамадзянін з уласцівым яго ўзросту імпэтам бяжыць у школьную сталоўку і талеркай гарачага сытнага супу падмацоўвае свае маладыя сілы, каб яшчэ з большай энергіяй узяцца за штурм лемантара, за вялікія сакрэты слова «рамы», якія «мыла Луша», каб яшчэ з большым гонарам і пачуццём пра-чытаць у тым-жа лемантары аб тым, што на сённешні дзень «мы не рабы». Ну як-жа тут не вучыцца яму, сінявокаму? І сінявокі вучыцца, набіраецца новых думак і ведаў. Сінявокі нават думае багата-а-а-та-багата вучыцца, каб потым стаць, чым-бы вы думалі? Ён думае стаць інжынерам, ён не супроць таго, каб быць лётчыкам. І камандзірам... — адказваюць, засаромеўшыся, некаторыя. Перабіраецца і яшчэ цэлы рад прафесій. Тут і доктар — «ён-жа ўсім дапамагае...», — і качагар паравозны... Самыя-ж улюбёныя прафесіі падрастаючых будаўнікоў — гэта лётчыкі і камандзіры. Есць нават ужо свае гатовыя, так сказаць, пісьменнікі і журналісты.

ЧАМУ ШКОЛА УЗОРНАЯ

Чым-жа, урэшце, дасягаецца вось гэта добрая паспяховасць вучняў, усе поспехі школы, яе няспынны рост, урэшце, яе ўзорнасць? Сакрэт тут ва ўпартай, настойлівай работе ўсяго настаўніцкага калектыва і, у прыватнасці, дырэктара школы Канстанціна Фёдаравіча Кяршука, як да рэчы, працуе тут ужо некалькі год, мае належны вопыт, мае добрыя арганізатарскія навыкі, набытыя ім у часе прабывання яго на адказнай камсамольскай рабоце.

І яшчэ адна з асноўных прычын поспеху школы, гэта шырокая ўвага і дапамога школе з боку грамадскіх арганізацый. Даволі ўспомніць такую лічбу, як дваццаць адну тысячу з лішкам рублёў, даных школе рознымі грамадскімі арганізацыямі ў часе падрыхтоўкі да гэтага навучальнага года, 3.000 падвод, прадастаўленых школе бясплатна ў часе яе абудовы, — і гэтыя лічбы размеру дапамогі гавораць аб шчырай заклапочанасці школай, любві да яе. Вельмі многа дапамагае броварны завод (шэф школы), калгас імя Сталіна, ды і ўсе калгасы сельсавета. Актыўна дапамагаюць школе і аднаасобнікі.

У дадатак—старанная, прадуманая работа настаўнікаў. Настаўнік любога класа не ідзе на лекцыю, не ведаючы, што ён будзе рабіць, і, галоўнае, як ён будзе рабіць. Да кожнай лекцыі падрыхтована спецыяльны рабочы план, дзе коратка, спісла вызначаны асноўныя вехі ўрока. Рыхтуючы гэты план, настаўнік прагледзеў патрэбную метадычную і дапаможную літаратуру, ён параўняў з загадчыкам навучальнай часткі тав. Непрашэйчам, урэшце, вялікі вопыт ён выносіць з работы існуючых у школе метадычных камісій і секцый — такіх камісій у школе шэсць.

Адзін раз у два тыдні адбываецца агульна-школьная нарада, на якую запрашаюцца таксама і настаўнікі суседніх школ. Арганізу

У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЯРШЫНСТВА

СОСКІН
Сакратар Аршанскага райкома КП(б)Б

Партарганізацыя Аршанскага раёна, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, дабіўшыся буйнейшай перамогі ў датэрміновым выкананні плана хлебапаставак і іншых палітычна - гаспадарчых кампаній, заваёўшы месца па ўсесаюзнай чырвонай дошцы, паставіла задачу — заваяваць пяршынства і ў ільнозагатоўках. І гэта задача паспяхова вырашана. Да вялікай гадавіны Окцябрскай рэволюцыі раён разлічыўся з дзяржавай па ўсіх відах абавязковых паставак і загатовак сельгаспрадуктаў.

Поспех выканання ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній, у прыватнасці ільнозагатовак, перш за ўсё залежаў ад таго, што партарганізацыя не самасупакойвалася, што аганёк большэвіцкага спаборніцтва, барацьбы за пяршынства ў рэспубліцы, за ганаровае месца сярод раёнаў Савецкага Саюза не пагасаў ні на хвіліну.

700 тон чырвонай апрацоўкі. Сказумела, гэта рабілася не само сабой: большэвіцкая перамога калгаснай Аршаншчыны арганізоўвалася партай і крапатлівай настойлівай работай усіх звенняў партарганізацыі.

Хоць Аршанскі раён і не з'яўляецца ільнаводчым раёнам, але мы не адкладалі пераапрацоўку ільну на другую чаргу. Поспех нашага раёна ў тым і заключаецца, што па ўсіх галінах, па ўсіх кампаніях работа вялася разгорнутым фронтам.

Райком партыі, райвыканком, палітаддзел МТС прынялі наступныя мерапрыемствы для фарсавання тэмпаў ручной пераапрацоўкі ільну і павышэння якасці ільнопрадукцыі.

Па-першае, **у кожным калгасе, звяне растлумачылі, што за выкананне нормы апрацоўкі ільну налічваюцца два працадні.** Мала гэтага, за перавыкананне норм, павышэнне якасці чыстага валакна мы **ўстанавілі сістэматычнае прэміраванне** для ўдарнікаў і ўдарніц калгасаў. А кіруючых работнікаў калгасаў, сельсоветаў, якія даюць лепшыя колькасныя і якасныя паказальнікі, раённыя арганізацыі прэміравалі веласіпедамі, патэфонамі, гадзіннікамі і інш.

Але, балай, адным з важнейшых мерапрыемстваў па стымуляванню пераапрацоўкі ільну з'явілася тое, што **ў гэтым годзе мы сур'ёзна растлумачылі калгасным масам,** што добрасумленная работа на ільне значна павышае і матэрыяльны добрабыт калгаснікаў—**гэта размеркаванне хлеба, атрыманага за лён толькі на працадні, выпрацаваныя на ільне.** Гэта раней не праводзілася. І каб не сеялася ў масах сумненне ў тым, ці выдадуць гэты хлеб іменна на ільняныя працадні, мы **дабіліся, што ў кожным калгасе ўжо ў першыя дні пераапрацоўкі ільну хлеб выдаваўся авансам ад 50 да 60 проц. толькі тым, хто працуе на ільне.**

У рэзультаце зацікаўленасці работай на мяльна - трапальных пунктах надзвычай вырасла. Нормы сталі не толькі выконвацца, а ў масе выпадкаў перавыконвацца, дасягаючы, напрыклад, па тропцы да 13-14 кгр. у дзень.

Але не толькі матэрыяльныя стымулы рухалі справу пераапрацоўкі ільну. **З самага пачатку шырока было разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва.** Запаўняліся дошкі тэмпаў, чорныя і чырвоныя дошкі. Для **лепшых ударнікаў і ўдарніц мы загатовілі спецыяльныя значкі ўдарніка.** Па гэтых значках ударнікі і ўдарніцы першымі атрымлівалі тавар у магазінах сельпо, у горадзе. Брыгадам, звеньням, якія ідуць упераадзе як па якасці, так і колькасці выпрацоўваемага ільну, перадаваліся чырвоныя пераходныя сцяжкі. У барацьбе за пяршынства вялікую ролю адыгралі сістэматычныя чырвоныя абозы з ільном. У прызначаны дзень кожны калгас, аднаасобны двор стараўся падрыхтаваць найбольшую колькасць і найлепшага ільну.

Чырвоныя абозы былі рэзультатам не шуміхі, а арганізаванасці. Яны не былі вынікам работы рыўкамі. Калгасам, брыгадам, аднаасобным дварам сістэматычна, з дня ў дзень даваліся аператыўныя заданні на пяцідзённіку і на дзень. У часе масавых чырвоных абозаў асабліва старанна правяралася выкананне гэтых заданняў. Гэту праверку рабілі не толькі кіраўнікі, але і самыя масы здатчыкаў.

Адстаючыя раёны ліся на перадавікоў.

Трэба адзначыць і такі момант, як арганізацыя агульна-сельсоветскіх свят. Напрыклад, у сельсавеце намячаюць: да 1 кастрычніка поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па кожнаму калгасу, аднаасобнаму двару, а потым разам святкаваць. І разлічваліся дакладна ў вызначаны тэрмін (Якаўлевіцкі, Зубаўскі і іншыя сельсоветы).

Былі ў нас і адстаючыя калгасы, якія пры ўсім жаданні на прычыне недахвату рабочай сілы не маглі своечасова справіцца. Такіх мы ўлічвалі своечасова і, не чакаючы прарыву, аказвалі ім сацыялістычную дапамогу з боку перадавых калгасаў.

І зараз мы прымаем усе меры да таго, каб вярнуць пяршынства, заваяванае намі ва ўпартай, настойлівай і цяжкай барацьбе.

ПРА МАЛАДЫХ ЗАЦЕЙНІКАЎ

Апошняе, на чым хочацца спыніцца, гэта шырока развітая дзіцячая самадзейнасць у сценах Урэцкай школы. У мінулым годзе працавалі ў школе такія гурткі, як два фізкультурныя, два гурткі маладых зацейнікаў, два музычныя, два хаўрэі, адзін літтурток, адзін стралковы, адзін авіямадэльны, тэхнічна-канструктарскі, фізіка-тэхнічны, два палітычныя і адзін радыёвурток. Гэтыя-ж гурткі аднаўляюцца і цяпер. Есць і канкрэтныя, адчувальныя, так сказаць, вынікі гэтай вучнёўскай самадзейнасці. Вось перад вамі работы літаратурнага гуртка за мінулы год: дзве старанна зробленыя, збраніраваныя і праілюстраваныя сваімі-ж мастакамі, рукапісныя часопісі «Малады горкавец», нумары першы і другі. Надзвычай трапная і прыгожая вокладка зроблена з пэўным эстэтычным густам і пачуццём. Яна ўпрыгожана любоўна зробленым партрэтам Алексея Максімавіча Горкага. У часопісе вершы, байкі, невялічкія апавяданні і нават крытычныя артыкулы. Свая тэматыка: калгас, мястэчка. Мяккая дзіцячая лірыка, зярняты будучых талантаў, першыя крокі да сур'ёзнага аўладання «сакрэтамі» мастацкага слова. Апрача «Маладога горкаўца» літгурток выданы два зборнічкі школьных фельетонаў. Так і называюцца зборнічкі «Фельетоны». Хіба не варта пашырыць гэты надзвычай культурны і цікавы пачын на ўсе школы нашай рэспублікі?

А работы іншых гурткоў? Вось трайныя зарысоўкі і фота сваіх мастакоў і фотакораў у класных насценгазетах, вось некаторыя даволі складаныя фізічныя прылады, зробленыя самімі вучнямі: тут і тэлеграфны ключ, і электрычны звонок, і розныя іншыя электрычныя прылады.

Што не пазайздросціць ім, гэтым маленькім уладарам вялікай будучыні, гэтым «наследным прынцам» нашай дзяржавы працы?

юцца спецыяльныя ўзорныя ўрокі, на якія запрашаюцца настаўнікі трох сельсветаў.

Зразумела, не ўсё яшчэ гладка ў рабоце школы, ёсць свае цяжкасці, нерашчоды. Часам яшчэ алчуваецца нясмелая, неспрактыкаваная рука маладога настаўніка, яго нерашучасць, момаенты замяшанасці на лекцыі. Няма яшчэ пасталых памяшканняў для фізічнага і хімічнага кабінетаў, няма вялікай агульнай залы з добра абсталяванай сцэнай, няма добрага фізкультурнага гарадка, шмат яшчэ чаго патрабуе школьная бібліятэка. Але ўсе гэтыя цяжкасці — цяжкасці росту школы вялікага, здаровага, радаснага. Цяжкасці, якія лёгка ліквідуюцца ў бліжэйшым часе.

Да рэчы, аб бібліятэцы. Школьная бібліятэка — адно з самых слабых месц ва ўсіх нашых школах, у тым ліку і Урэцкай. У бібліятэцы надзвычай мала кніг, калі прыняць пад увагу лік вучняў школы. Любы класік — рэдкі госць на школьнай паліцы. Ды ці мала яшчэ каго няма а буйнейшых прадстаўнікоў літаратуры. Настаўнікі ведаюць прадзешныя кніжныя навінкі, пр «День второй» Эрэнбурга, але дастаць іх у бібліятэцы не могуць. Мала і добраякаснай дзіцячай літаратуры.

Зусім залішне, здаецца, многа гаварыць аб вялікім значэнні ў сістэме школьнага выхавання добрай бібліятэкі. Гэта-ж так зразумела. А бібліятэкі вось кульгаюць, не паспяваюць за агульным ростам школ. Бібліятэкі школ патрабуюць на сённешні дзень самай неадкладнай і сур'ёзнай дапамогі як з боку Наркомасветы, так і з боку нашай шырокай пролетарскай грамадскасці. І ў першую чаргу мы павінны тут дапамагчы нашым узорным школам.

І яшчэ адзін важны момант: звычайна работу з бібліятэкай даручаюць у парадку нагрузкі якому-небудзь незагружанаму, а часцей — і менш вопытнаму таварышу, часам і мала знаёмаму з кнігай, літаратурай. Адсюль самацёк у рабоце бібліятэкі, адсутнасць глыбокай сістэматычнай работы з чытачом, вучнем, неарганізаванасць яго навучання чытання. Гэта трэба ў закласнага чытання. Добра было-б на кожнай змяніць. Добра было-б на вялікіх школах даручаць гэту справу спецыяльнаму работніку. А ў крайнім выпадку да актыўнага ўдзелу ў рабоце бібліятэкі, да шырокага кантролю над яе работай трэба прыцягваць усіх настаўнікаў літаратуразнаўцаў.

ПЕРАВЫБАРЫ СОВЕТАЎ

ДЗЕЛАВУЮ РАБОТУ ПАДМЯНІЛІ ШУМІХАЙ

ДУБРОЎНА, 11 лістапада (**По тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»**).

Ужо другі тыдзень, як у **Дубровенскім** раёне ідуць перавыбары советаў. Гэта важнейшая палітычная кампанія не выкарыстана для ўзняцця энтузіязма калгасных і працоўных мас аднаасобнікоў на барацьбу за пяршыковае завяршэнне ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній усяго гаспадарчага года.

За ганебны зрыў ільнозагатовак раён знаходзіцца на чорнай дошцы. Ён цягнецца ў самым хвосце сярод раёнаў рэспублікі, займаючы 75 месца. Гэта мала каго турбуе ў раёне. Дзелавая падрыхтоўка да выбараў і самі выбары падмяняюцца знадворнай парадной шуміхай.

Возьмем Мардашэвіцкі сельсавет. Тут на перавыбарчых сходах былі музыка і гулянкі, песні і скокі, а справа з ільнозагатоўкамі не зрушылася з месца. Так і ў другіх советах, так ва ўсім раёне. Аб гэтым выразна гаворыць адна лічба: **за апошнюю пяціднеўку — разгар перавыбарчай кампаніі — загатоўлена ільну 2,3 проц.** На 10 лістапада план выканан усяго на 33,5 проц.

Няма баявой палітычнай работы вакол справы выбараў органаў пролетарскай дыктатуры. Няма канкрэтнага кіраўніцтва выбарчай кампаніяй.

Аб гэтым гавораць два наступныя факты.

Як падбіраюцца кандыдатуры старшынь сельсоветаў? У тым-жа Мардашэвіцкім сельсавеце РК партыі і РВК на пасаду старшыні сельсавета рашылі рэкамендаваць старшыню калгаса імя Кагановіча Прудзікава. Яго правялі ў склад членаў сельсавета; выбралі членам сельсавета і былога старшыню сельсавета т. Каштанава, хоць у раёне і меркавалі перакінуць яго на работу ў другі сельсавет.

Сабраўся першы арганізацыйны пленум.

Пачалі выбіраць старшыню сельсавета. Тут намеснік старшыні РВК т. Бязлюдаў, прысутнічаўшы на пленуме, раптам унёс прапанову:

— Раю Каштанава.

Пад апладысменты замест Прудзікава быў выбран Каштанаў.

У чым-жа тут справа? А справа ў тым, што РК і РВК, высоўваючы на пасаду старшыні сельсавета Прудзікава, не ведалі яго твару.

Толькі на пленуме высветлілася: **што калгас імя Кагановіча, у якім Прудзікаў старшынствуе, заўсёды ішоў у хвосце і зараз ганебна зрывае ільнозагатоўкі.** Карацей гаворачы, кандыдатуру Прудзікава ў члены сельсавета адвялі, як нягодную.

Гэты факт гаворыць аб тым, як РК партыі і РВК «ведаюць» свой актыў: зрыўшчыка ільнозагатовак высоўваюць на пасаду старшыні сельсавета.

Возьмем цыпер паказ, які прымаецца на выбарчых сходах. Ён ад першага да апошняга пункта складаецца з агульных фраз. Напрыклад, пункт 3: «У галіне сельскай гаспадаркі» гаворыць: «За ажыццяўленне лозунга тав. Сталіна—зрабіць калгасы большэвіцкімі і ўсіх калгаснікаў заможнымі —кожны дэпутат совета ў сваёй штодзённай рабоце павінен усямерна садзейнічаць арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў...» Аб задачах па выкананню плана ільнозагатовак —ні слова ва ўсім паказе, які складаецца з 7 пунктаў цэлай лістоўкі на чатырох старонках, надрукаванай у раённай друкарні.

Такі агульны паказ прымаецца на перавыбарчых пунктах ва ўсім раёне. У адным месцы даюць свае дапаўненні, а ў другіх і без гэтых «дробязей» абыходзяцца.

І думаюць дубровенскія таварышы, што такім шляхам яны забяспечаць большэвіцкае правядзенне выбарчай кампаніі.

А. МІКУЦКІ.

Хлебазакупкі

РАБОТА З КАЛГАСНЫМ АКТЫВАМ ЗАБЯСПЕЧЫЛА ПОСПЕХ

ЛІСКОВІЧ
Сакратар Касцюковіцкага райкома КП(б)Б

Касцюковіцкая партарганізацыя прыпяла да 17 гадавіны Окцябрскай рэволюцыі з радам дасягненняў у выкананні асноўных важнейшых гаспадарча - палітычных кампаній.

На 5 лістапада выканан поўнасцю план ільнозагатовак, заготулена 1.600 тон зернавых культур, план узняцця зяблева выкананы на 113 проц. і інш.

З пачатку зімоўнай кампаніі склікалі пленум РК і РВК з удзелам старшынь сельсоветаў, парторгаў і старшынь буйных калгасаў, дзе намецілі канкрэтныя мерапрыемствы і метады работы па забеспячэнню выканання задання партыі і ўрада.

У дапамогу сельсоветам было выдзелена па аднаму работніку з раённага партактыва.

Асаблівасць правядзення мерапрыемстваў па закупцы хлеба заключаецца ў тым, што ўсю масавую палітычную і растлумачальную работу сярод калгаснікаў аб продажы хлеба праводзіў сам сельсавецкі і калгасны актыў (старшыня і члены праўлення сельсавета і члены праўлення калгасаў, настаўнікі і інш.).

Трохтыднёвая баявая аператыўная работа акрэсліла паспяховыя рэзультаты па закупцы хлеба.

Асноўная ўвага ў арганізацыі продажу хлеба дзяржаве і правядзенні масавай палітычнай работы сярод калгаснікаў была звернута на работу з калгасным актывам. **Перш чым ставіць пытанні аб продажы хлеба на калгасных сходах, праводзіліся спецыяльныя нарады і гутаркі з актывам калгаса.** Яны на агульных сходах выступалі і дакладвалі палітычную неабходнасць і гаспадарчую выгаду для калгаса — прадаць хлеб дзяржаве. Асобна мы выкарыстали ў нашай масавай рабоце той факт, што вясной гэтага года калгасы раёна атрымалі ад дзяржавы значную харчовую дапамогу. Іменна гэты факт быў лепшым агітатарам за продаж хлеба дзяржаве.

З найбольш пашыраных метадаў былі рашэнні агульных сходаў калгасаў аб продажы хлеба часткова з агульнага калгаснага фонда на набыццё тавараў і часткова шляхам індывідуальнай падпіскі калгаснікаў на продаж хлеба. Практыкавалася таксама метады продажу чэўнай часткі (у грамах) або процанта ад працадня.

Першымі ініцыятарамі і лепшымі арганізатарамі, паказаўшымі прыклад у хуткасці рэалізацыі продажы хлеба, з'яўляліся калгасы «Баявік» (старшыня калгаса Шасцярнёў), «Інтэрнацыянал» (старшыня Міркін), «Беларуская вёска» (старшыня Хлесцякоў) і інш.

Пэўныя труднасці па закупцы хлеба ў нас ствараліся ў сувязі з недастатковым забеспячэннем таварамі. Шкло, жалеза, тканая мануфактура і асабліва газа карыстаюцца вялікім попытам у калгаснікаў. Аднак, кааперацыя не зрабіла яшчэ забяспечыць гэтымі таварамі працаўніка хлеба. Аб дрэнай рабоце БКС, сведчыць яшчэ той факт, што на працягу 6 тыдняў занарадзіныя 15 веласіпедаў для стымулявання закупак хлеба пімі не могуць трапіць у раён.

Перавыбары советаў партарганізацыяй будуць выкарыстаны для поўнага выканання задання па хлебазакупках.

Да ўвагі пракуратуры рэспублікі

„НЕ ПРЫМАЮ"

ЧАВУСЫ. (**Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»**).

Старшыня Амхініцкага сельсавета Паўленка арганізоўваць закупкі хлеба нават і не думала. Калгаснікі самі абмеркавалі колькі хлеба яны могуць прадаць дзяржаве і колькі можа прадаць калгас для закупкі неабходных рэчаў.

Паўлюкова турбавала адно пытанне—як-бы гэты хлеб не пайшоў у лік закупак Заготзярно. Яна абышла двары калгаснікаў і сурова папярэдзіла іх: «Глядзіце, хлопцы, калі толькі вы прадасцё хлеб Заготзярно, да мяне за таварамі не хадзіце».

Загадчык Заготзярно **Набебам** па калгасах таксама хадзіць не збіраўся. Яго нічога не турбавала. Ён быў упэўнен, што раз на пункт прывязуць хлеб, ён яго заўжда ў лік сваіх закупак.

Прывезлі калгаснікі калгасу «Серп і молат» 6 цэнтнераў збожжа, прадаляюць пуцёўку ад сельсавета і просяць прыняць хлеб.

— Не прымаю,—злосна адказаў Набебам. — калі хочаце, здавайце ў лік маіх закупак, а не, дык вязіце назад.

І павезлі калгаснікі хлеб за 20 кілометраў назад. Тое-ж паўтаралася і з іншымі калгасамі. Адвёз назад хлеб і калгас «Зара Окцября».

Калгасы Амхініцкага сельсавета спынілі вывазку хлеба. Нехай яны паперад між сабой дагаворацца, а потым павязём»,—рашылі калгаснікі.

Паўлюкова і Набебам і не думалі дагаварвацца. Яны сваю справу зрабілі. Хлеб не паступае ні ў лік закупак сельпо, ні ў лік закупак Заготзярно. Гэтыя, кулацкія агенты Паўлюкова і Набебам задаволены. Іх не турбуе тое, што Амхініцкі сельсавет закупіў толькі 23 проц. таго, што калгаснікі абавязаліся прадаць.

Не толькі гэтыя ўзаемаадносіны паміж сельпо і Заготзярно з'яўляюцца адзінай прычынай зрыву закупак хлеба. Кулацкія элементы і іх агенты прымаюць розныя меры, абы сарваць закупкі.

Старшыня калгаса імя **Варашылава** Вайцянкоў, старшыня калгаса «Раніца» Жаўранкоў знарок спынілі абмалот хлеба. Гэтыя-ж кулацкія агенты зрываюць размеркаванне ўраджаю, агітуюць сярод калгаснікаў аб тым, што «на канчатковых падліках» вага працадня значна зменшылася, а таму прадаць хлеб дзяржаве не трэба. Зусім спыніўся продаж хлеба ў Самулкаўскім і Сухараўскім сельсоветах.

Райспажыўсаюз, як і астатнія раённыя арганізацыі, пусціў закупкі хлеба на самацёк. Самыя вострыя дэфіцытныя тавары, у якіх маюць патрэбу калгаснікі і аднаасобнікі, ляжаць на складах райсаюза, не паступаюць у сельпо.

Раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі і не думаюць прыцягваць да адказнасці зрыўшчыкаў хлебазакупак. Кулацкія агенты бесперашкодна роблюць сваю агідную справу.

ГРЫГІГЛАЗ.

ШКЛО, ЦВІКІ... ПАД ПРЫЛАУКАМ

Петрыкаўскі райсаюз закупіў 252 тоны хлеба. З гэтай колькасці ў аднаасобным сектары закуплены толькі 4 тоны.

Аб тым, што работа сярод аднаасобнага сектара ігнаруецца, сведчаць Глінцкае, Грабаўскае, Лясковіцкае, Капцэвіцкае, Петрыкоўскае і інш. сельпо, якія да гэтага часу не закупілі ні аднаго кілограма хлеба ў аднаасобнікаў.

Райсаюз не ўстанавіў кантролю над выдаткаваннем сельпо тавараў, прызначаных для закупкі хлеба.

Паламо некалькі прыкладаў.

Бабуніцкае сельпо закупіла 26 тон хлеба, а прадало тавараў хлебнага фонда толькі на 72 руб.

Можа ў сельпо няма тавараў? Ёсць, ёсць патэфоны з пласцінкамі, махоркі на 450 руб., сукна на 320 руб., ёсць цукар, ліхтары «Ляцучая мыш», ёсць веласіпеды і т. д. Асартымент, як быццам, не дрэнны, але дрэнная работа сельпо прывяла к таму, што ўвесь тавар ляжыць у краме.

Галюшчавіцкае сельпо закупіла 4 тоны хлеба, а рэалізавала тавараў хлебнага фонда на 277 руб., што таксама далёка недастаткова.

Характэрна, што цвікі, шкло і інш. будаўнічыя матэрыялы, у якіх калгасы адчуваюць асаблівую патрэбу, сельпо схавала.

КУМОК.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ БАБРУЙСКАГА РК КП(б)Б тав. МІЛЛЕРУ.

ПРАКУРОР МАРГУС ПАКРЫВАЕ ЗЛАЧЫНЦАЎ

(Пісьмо члена арцелі).

У пумары за 2 жніўня г. г. «Звязда» змясцила пісьмо рабочага Салавейчыка аб разбазарванні загадчыкам сталоўкі мэблевай арцелі «Большэвік» Розенфельдам і яго «прыяцелямі» Шэнклерам і Фішманам розных прадуктаў і аб растраце кіраўніцтвам арцелі больш 50.000 руб. грошай.

Праз пекаторы час — 22 жніўня — пракурор Маргус паведаміў праз «Звязду» грамадскасць аб тым, што ўказаныя ў пісьме факты пацвердзіліся і што старшыня арцелі Хейман і загадчык сталоўкі Розенфельд аддадзены пад суд.

Не тое на справе. Віноватыя і па сёнешні дзень асталіся не пакаранымі. Ім змянілі толькі месца работы. Розенфельд загадвае сталоўкай пры заводзе «Чырвоны металіст», Шэнклер — крамай лесапрамгаса, Фішман працуе ў канторы Заготжывёлы.

Паўстае пытанне — ці можна далейшым верыць паведамленням пракурора Маргуса?

Л. ТЫНКОЎ.

АД РЭДАКЦЫІ:

З пісьма т. Тынкова відаць, што пракурор Бабруйскага раёна т. Маргус не ўмее настойліва змагацца са злачынцамі, не ўмее дабіцца хуткага расследвання матэрыялаў і прыцягнення вінаватых да адказнасці. Мала напісаць заключэнне — аддаць пад суд, трэба яшчэ прасачыць, каб і ў судзе справа не заляжалася. Вось гэтага і не зрабіў т. Маргус, чым пасутнасці стаў на шлях патурання злачынцам.

НАРКОМАСВЕТЫ тав. ЧЭРНУШЭВІЧУ.

У СТАЎБУНСКАЙ ШКОЛЕ НЕ ВЫКЛАДАЮЦЬ РУСКАЙ МОВЫ

(Пісьмо вучня).

Ужо прайшло два з паловай месяцы навучальнага года, а **ў Стаўбунскай** няпоўнай сярэдняй школе **Веткаўскага раёна** яшчэ да гэтага часу няма выкладчыка па рускай мове. Лекцыі рускай мовы зрываюцца.

Вучні 7 класа кожны дзень чакаюць выкладчыка, бо ў 1935 годзе яны канчаюць школу і хочуць ведаць рускую мову.

Але ніхто не ідзе ім насустрач. Загадчык раёна ніякіх мер не прымае, каб укамплектаваць Стаўбунскую школу выкладчыкамі.

Патрэбна тэрміновае ўмяшанне Наркомасветы.

САВАСЦЕНКА.

НАМ ПІШУЦЬ

У калгасе **«Ясная зорка» (Веткаўскага раёна)**, як пішуць калгаснікі **Халіпаў, Цыганкоў і Цімашкоў** у гэтым годзе шмат коней хварэлі мінінгітам. Ветарынарны ўрач **Бурэкоў** ніякіх мер не прыняў, каб захаваць жывёлу ад падзяжу і не ўказаў правіл лячэння коней.

Цяпер ветэрынарным урачом працуе тав. Герын, які, агледзеўшы коней, зараз-жа прыняў прафілактычныя меры.

У выніку добрасумленных і ўважлівых адносін тав. Герына да лячэння коней ні адзін конь у калгасе не паў.

Праўленне калгаса «Ясная зорка», ацаніўшы работу ветдактара Герына, вынесла яму падзяку.

Па слядах пісем

„Так школы не пабудуеш"

Пад такім загалоўкам у **«Звязде»** 11 кастрычніка было змешчана пісьмо **Шаблінскага.**

Мазырскі РВК паведамляе, што **будаўніцтва школы ўжо закончана. Зарплата** рабочым **выплачана** поўнасцю.

„Два гады цяганіны"

На змешчанае ў «Звязде» № 146 ад 5 лістапада пісьмо калгаснікаў «Два гады цяганіны» Мазырскага РК КП(б)Б паведамляе, што незаконна забраная карова ў калгасніка **Астрэйкі** звернута яму назад.

„ЧАМУ КУЛАЦКІЯ АГЕНТЫ І ТЭРАРЫСТЫ Ў МАГІЛЕЎСКІМ РАЁНЕ ЗАСТАЮЦЦА БЕЗПАКАРАНЫМІ"

Паведамленне пракуратуры рэспублікі

Для расследавання фактаў, прыведзеных ў артыкуле «Чаму кулацкія агенты і тэрарысты ў Магілеўскім раёне застаюцца безпакаранымі», апублікаваным у «Звязде» 12 лістапада г. г., і для скончэння следства па справам аб збіцці калгаснікаў актывіста Чарнова і забойстве актывіста Іпаліцева 13 лістапада на месца выехаў пракурор т. Серпень.

Пракурор рэспублікі КУЗМІН.

ЯК У ПОЛАЦКУ РЭАГУЮЦЬ НА СІГНАЛЫ ДРУКУ

(Пісьмо работнікаў райгазеты)

За апошні час газета «Чырвоная Полаччына» на сваіх старонках выкрыла пэлы рад фактаў засмечанасці калгасаў кулацкімі і шкодніцкімі элементамі, грубога заціску крытыкі і самакрытыкі, скажэння зямельнай палітыкі партыі.

Газета не раз пісала аб засмечанасці калгасам імя Дзержынскага, Кулікоўскага сельсавета; аб калгасах «Спелы колас», «Чырвоная ніва» і іншых, дзе рад год кулакі вялі работу супроць пасеву ільну (пад лён адводзіліся горшыя землі, горш апрацоўваліся); аб калгасе «Чырвоная ніва», дзе лён знарок быў пакінут на карані, пакуль не згніў і т. д.

Газета выкрыла таксама кулацкага агента Грыгор'ева (старшыня Кулікоўскага сельсавета), які кулакам вылаваў даведкі аб тым, што яны беднякі, укрываў іх ад дзяржаўных паставак, дазваляў ім, (кулакам) прадаваць зямлю. Гэты-ж Грыгор'еў самавольна павышаў пасеўныя планы калгасам за кошт памяншэння іх у аднаасобным сектары.

Селькоры праз газету выкрылі сакратара Маласітнянскага сельсавета, жуліка Глазкіна, які, як і Грыгор'еў, кулакоў ператвараў у беднякоў, укрываў іх ад удзелу ў дзяржаўных паставках.

Ні на адзін з гэтых сігналаў не рэагаваў ні райком партыі, ні РВК, ні іншыя раённыя арганізацыі. Многа раз пісала газета аб развале комсамольскай і фізкультурнай работы ў раёне.

Праўда, на гэты сігнал райком партыі адгукнуўся велізарнай пастановай, якая да рэчы, і цяпер не выканана.

Нядаўна рэдакцыя правяла рэйд праверкі рэагавання на пісьмы і скаргі працоўных. Выяўлена, што дырэкцыя Полацкай МТС агубіла каля 40 рабселькораўскіх пісем. **Каля 100 пісем, на якія не паслалі адказы, ляжаць і ў дырэктара Ветрынскага МТС Асіпоўскага. Дырэктар Полацкай МТС Рэзнікаў на патрабаванні брыгады аднаказаць, куды падзеліся селькораўскія пісьмы, адказаў: «Начхаць мне на вашы сігналы».**

Але і гэтыя факты не прымусілі райком партыі і іншыя раённыя арганізацыі ўзяцца за сапраўднае і большэвіцкае рэагаванне на скаргі і пісьмы працоўных.

У Полацку не жадаюць выкорэнваць дырэктыў партыі аб уважлівых і чулых адносінах да пісем і скарг працоўных.

Работнікі райгазеты Г. Голанд, Р. Канавалаў і Смалянскі

***

АД РЭДАКЦЫІ: Аўтары пісьма зусім правы, калі сцвярджаюць што: «У ПОЛАЦКУ НЯМА ЧУЛЫХ ЧАЛАВЕЧЫХ АДНОСІН ДА СКАРГАЎ ПРАЦОЎНЫХ». Не рэагуюць у Полацку не толькі на выступленні сваёй раённай газеты, але на сігналы і пісьмы перасылаемыя цэнтральнымі газетамі.

Так, на працягу больш 4 месяцаў не адказваюць полацкія райарганізацыі «Звязде» на 24 пісьмы. Прычым ПРЫКЛАД САМЫХ АБУРАЮЧЫХ АДНОСІН ДА ПІСЕМ ПАКАЗВАЕ САМ РАЙКОМ ПАРТЫІ.

З 21 жніўня ён не адказвае на карэспандэнцыю аб масавым ў раёне выключэнні з калгасаў, з 28 жніўня марыную пісьмо т. Уліновіча пра калгас «ОКЦЯБР» Замшанскага сельсавета, кіраўніцтва якога сістэматычна на калгасным сродкі нападжвае папойкі. 7 кастрычніка «Звязда» асабіста сакратару РК тав. Турпаю паслана пісьмо т. Фельдмана аб тым, што нова-арганізаваным калгасам не адводзяць зямлі і інш.

Не адказаў райком партыі «Звязде» на 11 пісем. Змяшчаючы пісьмо групы работнікаў газеты «Чырвоная Полаччына», мы чакаем ад Полацкага РК і яго сакратара т. Турпая гласнага адказу аб прынятых ім мерах.

РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕННІ РАБОЧЫХ У ВЕНЕ

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ ПА ЎСЕЙ АЎСТРЫІ

БЕРЛІН, 13 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Вены, там у апошнія дні мелі месца масавыя вулічныя выступленні комуністычных і соцыял-дэмакратычных рабочых супроць урада ў сувязі з гадавінай стварэння аўстрыйскай рэспублікі. Асабліва сур'ёзны характар выступленні рабочых прычялі ў тых раёнах Вены, якія з'яўляліся цэнтрам рэвалюцыйнай барацьбы ў часе лютаўскіх падзей, а іменна—Флорыдсдорфе і Пратары. Ва ўсіх раёнах горада комуністычныя і соцыял-дэмакратычныя рабочыя адкрыта распаўсюджвалі адозвы, азаглаўленыя:

«Мы яшчэ вернемся», «У гонар забітых 12 лютага», «У барацьбе мы адзіны».

Паліцыя Вены прыведзена ў баявую гатоўнасць. Згодна слоў газет, усе гэтыя паліцэйскія мерапрыемствы не змаглі, аднак, прадухіліць шматлікіх вулічных дэманстрацый, удзельнікі якіх аказвалі супраціўленне паліцыі.

«Кельнішэ цэйтунг» паведамляе, што ў апошнія дні паліцыя зрабіла шматлікія арышты сярод комуністычных і соцыял-дэмакратычных рабочых не толькі ў Вене, але і ў іншых гарадах Аўстрыі. Усяго арыштавана некалькі тысяч чалавек. У адной Вене за апошнія 36 гадзін арыштавана 847 комуністычных і соцыял-дэмакратычных рабочых.

ВАКОЛ УСХОДНЯГА ПАКТА

ПАРЫЖ, 12 лістапада. (БЕЛТА) Паведаны ў справах СССР па Францыі т. **Розенберг** наведаў сёння міністра замежных спраў **Лаваля**, з якім меў доўгую гутарку аб франка-савецкіх адносінах. Паводле слоў Гавас, у гутарцы была аддана асабліва ўвага праекту ўсходняга пакта.

Гавас паведамляе пры гэтым, што міністэрства замежных спраў рыхтуе ноту, якая будзе неадкладна перадана ў Варшаву. Нота прыводзіць пункт гледжання французскага ўрада па поваду ноты, перададзенай Бекам Барту ў канцы апошняй сесіі Лігі нацый. Як вядома, польская нота, гаварыўшая аб адносінах Польшчы да ўсходняга пакта, амяшчала многа агаворак. Аднак, на думку Гавас, пры сучасных абставінах падзея на далучэнне Польшчы да пакта не можа быць поўнасцю пакінута.

Выбарчая барацьба ў ЗША

У штаце Луізана адбывалася жорсткая перадвыбарчая барацьба паміж двумя дандыдатамі на губернатарскі пост. Нацыянальная гвардыя вымушана ахоўваць кандыдатаў, каб упікнуць нападу на іх прадстаўнікоў процілеглай групы.

На здымку: узброеныя гвардзейцы ахоўваюць кандыдата (сенатара Лонга).

ПРАЕКТ ДЗЯРЖБЮДЖЭТА Ў ПОЛЬШЧЫ НА 1935-36 год

ВАРШАВА, 11 лістапада. (БЕЛТА). Праект дзяржбюджэта на 1935-1936 бюджэтны год пастаўлен на абмеркаванне польскага сойма. Даходная частка бюджэта вылічана ў суме 1.983 млн. злотых, расходная частка — у суме 2.133 млн. злотых. Такім чынам, бюджэт складзен з дэфіцытам, які даходзіць да 150 млн. злотых. Не гледзячы на вычарпанне сродкаў для пакрыцця дэфіцыту з «нацыянальнай пазыкі» і адсутнасць новых крыніц даходу, так званыя «жалезныя артыкулы» бюджэта не падвяргаюцца ніякаму скарачэнню. Гэта адносіцца да бюджэта ваеннага міністэрства, міністэрства ўнутраных спраў, міністэрства юстыцыі і міністэрства замежных спраў. У бюджэце-ж міністэрства прамысловасці і гандлю прадугледжана нават павышэнне расходаў, якое тлумачыцца афіцыяльна «патрабамі марскога флота». Побач з гэтым значнаму скарачэнню падвяргаюцца ў першую чаргу расходы міністэрства асветы і на патрэбы сацыяльнага забеспячэння.

Праект бюджэта ў апазіцыйным друку сустракае вельмі скептычную ацэнку. На пытанне, адкуль узяць сродкі для пакрыцця дэфіцыту ў 150 млн. злотых, дакладнага адказу не можа даць ні ўрадавы, ні апазіцыйны друк. Пераважае думка, што пасля зацвярджэння бюджэтнага праекта ў сойме і сенаце трэба чакаць рэзкага скарачэння часткі бюджэтных расходаў. У той-жа час выклікае трывожныя размышленні той факт, што axвярай бюджэтнага скарачэння падае ў першую чаргу бюджэт міністэрства асветы.

ФАШЫСЦКАЯ КАМПАНІЯ СУПРОЦЬ „ТАВАРЫСТВА ПРЫЯЦЕЛЯЎ СССР" У РУМЫНІІ

ВЕНА, 12 лістапада. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Бухарэста, румынскі фашысцкі і шавіністычны друк вядзе рэзкую кампанію супроць «Таварыства прыяцеляў СССР» у Румыніі, шырока фазгарнуўшага сваю дзейнасць. Кампанія інспіруецца міністэрствам унутраных спраў і ахраткай. У членаў выбранай таварыствам дэлегацыі на окцябрскія ўрачыстасці ў Маскве адабраны пашпарты. Ім абяцалі вярнуць пашпарты пасля 7 лістапада. Газета, якая выдавалася «Таварыствам прыяцеляў СССР», забаронена. Амаль усе члены таварыства, у тым ліку адзін былы прэфект, арыштаваны.

Як паведамляюць, пасля прадастаўлення адставкі ўсю «Таварыства прыяцеляў СССР» у Ільфаве праў юрыдычнай асобы мясцовая фашысцкая газета «Аппарарэа нацыянала» стала заклікаць да разгрому таварыства і да забойства ўсіх яго членаў.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ФІНАНСАВАЯ НАРАДА

У нарадзе прымае ўдзел наркомфінансаў СССР тав. Грынько

Учора днём у вялікай зале дома Комасветы адкрылася ўсебеларуская фінансавая нарада, на якую з'ехалася 112 дэлегатаў—сакратароў райкомаў партыі, старшынь райвыканкомаў, начальнікаў палітаддзелаў, загадчыкаў і работнікаў райфа і ан чалкас.

У нарадзе прымае ўдзел **народны камісар фінансаў Саюза ССР тав. ГРЫНЬКО.** Для ўдзелу ў нарадзе прыбылі таксама з Масквы старшыня ЦК саюза фінансава-банкаўскіх работнікаў тав. **ЗАСЛАЎСКІ,** і начальнік кіраўніцтва масавых пазыкаў Наркамфіна Саюза тав. **ТАМАРКІН.**

Нараду адкрыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. **ВАЛКОВІЧ.** Ва ўступным слове тав. Валковіч падрабязна спыніўся на задачах, якія стаяць перад партыйнымі і совецкімі арганізацыямі, і ў прыватнасці перад фінансавымі органамі БССР, напярэдадні скалачэння гаспадарчага года і ў сувязі са справаздачна-перавыбарчай кампаніяй совецкіх і падрыхтоўкай да VII усесаюзнага і XI усебеларускага з'ездаў совецкіх.

— БССР мае ўсе магчымасці і павінна прыйсці да з'ездаў совецкіх з стопроцантным выкананнем плановаў па ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях,—сказаў т. **ВАЛКОВІЧ.** —Фінплан у IV квартале вы павінны не толькі выканаць, але і перавыканаць.

З дакладам аб выніках выканання фінплана за III квартал і далейшых задачах па выкананню фінплана IV квартала выступіў народны камісар фінансаў БССР тав. **ХАЦКЕВІЧ.**

Па дакладу тав. Хацкевіча разгарнуліся спрэчкі. Першым выступіў т. **ТРЫЗНА**—старшыня РВК пе радавота па выкананню фінплана **Чашніцкага раёна.** Затым выступілі тт. **Мінковіч** (завод імя Варашылава), **Залескі** (Менгорсовет), **Мішчанка** (завод імя Молатава), якія дзяліліся вопытам сваёй работы і віталі ўдзель лікаў нарады і наркамфіна Саюза тав. **ГРЫНЬКО.** Тав. **МІНКОВІЧ** расказаў дэлегатам нарады, як завод імя Варашылава змагаецца за выкананне промфінплана, як ён шэфствуе над Наркамфінам. Тав. **Мішчанка** паднёс т. **Грынько** ад імя калектыва рабочых завода імя Молатава рапарт, спецыяльна зроблены рабочымі на дрэве.

На гэтым скончылася дзённае пасяджэнне нарады.

***

На нарадзе прысутнічаюць нам. старшыні СНК БССР тав. **СААК'ЯН** і загалчык совецка-таддлёвага аддзела ЦК КП(б)Б тав. **КУДЗЕЛЬКА.**

***

Учора днём наркамфін Саюза ССР тав. **ГРЫНЬКО** наведаў завод імя Варашылава. Варашылаўцы наладзілі наркому ўрачыстую сустрэчу. Тав. Грынько выступіў на лятучым мітынгу з прамовай.

***

На вячэрнім пасяджэнні прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. ХАЦКЕВІЧА. Выказалася 12 чалавек. З прывітаннем ад ударнікаў фінфронта горада Менска і раёна выступіў тав. **ВАЎЧОК.** Ён паведаміў, што рабочыя менскіх прадпрыемстваў арганізуюць буксірныя брыгады ў дапамогу адстаючым раёнам—Горацкаму, Заслаўскаму і Смалявіцкаму. Тав. Ваўчок паднёс тав. Грынько альбом лепшых ударнікаў фінфронта. Віталі тав. Грынько таксама пельчыцкія піонеры. Тав. **МІГАЙ** зачытаў пастанову цэнтральнай камісіі содзейнасці дзяржкрадыту і НКФ, у якой адзначаны заслугі пельчыцкіх юных ударнікаў фінфронта і прз міраванне 14 лепшых з іх.

З вялікай прамовай на нарадзе выступіў народны камісар фінансаў СССР тав. ГРЫНЬКО.

Нарада паслала прывітальныя тэлеграмы тт. ГІКАЛО, ГАЛАДЗЕДУ і ГРЫНЬКО. Учора пасля заключнага слова тав. СААК'ЯНА нарада закончыла сваю работу.

На пабудову агітзвяна самалётаў імя III усебеларускага з'езда рабселькораў рэдакцыя газеты **«Чырвоная Полаччына»** ўносіць 146 руб.

І. ЕСМАН.

***

Газета «За большэвіцкія калгасы» палітаддзела Аршанскай МТС разгарнула вялікую работу па збору сродкаў на агітзвяно.

Калгасныя калгаса «Чырвоны бераг», Пішчалаўскага сельсовета, унеслі на пабудову агітзвяна 559 руб. Калгаснікі калгаса «Новы быт» уносяць 493 руб., «Прамень соцыялізма»—150 руб., «Парыжская комуна»—175 руб., «Чырвоныя Новасёлкі» —112 руб. і т. д. Усяго дагэтуль сабрана 2.101 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

Выклікаем паследаваць нашаму прыкладу аршанскую раённую газету «Ленінскі прызыў», газету «За большэвіцкія калгасы» (палітаддзела Рагачоўскай МТС) і ўсе астатнія палітаддзельскія газеты БССР.

Рэдактар палітаддзельскай газеты Аршанскай МТС. З. ХАНІН.

ЮБІЛЕЙ тав. ЛАПІДУСА

12 лістапада ў клубе Наркамата Унутраных Спраў адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 10-гадоваму юбілею спартыўнай работы комсамольца **ЛАПІДУСА**—чэмпіёна СССР і БССР па гірах.

Юбіляра віталі ад беларускага совета «Дынамо» тав. **Розін,** ад ЦК і гаркома ЛКСМБ т. **Галкоўскі,** ад маскоўскіх фізкультурнікаў—заслужаны майстар спорта Саюза т. **БУХАРАЎ,** ад комсамольскай арганізацыі Наркамата Унутраных Спраў т. **ЗАЙКІН** і інш.

На імя т. Лапідуса атрымана каля 70 прывітальных тэлеграм, у тым ліку ад ВСФК Саюза, ЦК ЛКСМБ, маскоўскіх фізкультурнікаў, украінскага совета фізкультуры і т. д.

Тав. Лапідус узнагароджан каштоўнымі падарункамі.

Пасля ўрачыстай часткі адбылася сустрэча з удзелам маскоўскіх фізкультурнікаў на гірах, боксу і барацьбе. Тав. Лапідус, прымаючы ўдзел у гэтай сустрэчы, устанавіў новы ўсесаюзны рэкорд, выціснуўшы двума рукамі 85 кілограм 600 гр.

„ТРИ ПЕСНИ О ЛЕНИНЕ" ЗНОЎ БУДУЦЬ НА ЭКРАНАХ МЕНСКА

У сувязі з узнятым у «Звяздзе» за 12 лістапада пытаннем аб звароце на менскі экран фільма «Три песни о Ленине», Белдзяржкіно паведамляе, што ў бліжэйшыя дні гэты фільм выключнага палітычнага і мастацкага значэння зноў будзе пастаўлен на экранах г. Менска.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Менгарком КП(б)Б склікае 14 лістапада раўна ў 6 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва (вялікая зала) **нараду сакратароў парт комаў,** парторгаў, старшынь ФЗМК і сакратароў ЛКСМ камітэтаў усіх прадпрыемстваў, устаноў, ВНУ і тэхнікумаў гор. Менска па пытанню практычных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да справаздачна-перавыбарчай кампаніі горсовета.

Яўка вышэйпаказаных таварышоў абавязкова.

Нам. сакратара Менгаркома КП(б)Б **ХАДАСЕВІЧ.**

Аддзел культуры і прапаганды ленінізма Менгаркома КП(б)Б даводзіць да ведама **ўсіх прапагандыстаў** партыйнай і комсамольскай сеткі, што 15 лістапада адбудуцца па-зачарговыя заняткі **пропсемінараў:** кандыдацкіх школ, СПШ і гурткоў па гісторыі партыі, гурткоў па ленінізму і комсамольскіх палітшкол, на якіх адбудзецца разгляд стэнаграм заняткаў прапагандыстаў: тт. Турбовіч, Лазарава, Краўчука і Кавальчука.

Яўка ўсіх прапагандыстаў (і асла банёных ад наведвання пропсемінараў) абавязкова.

Заг. аддзела культуры і прапаганды ленінізма ГК КП(б)Б ВАРОНЧАНКА.

Юбілей 25-гадовай творчасці М. Ф. Рафальскага

Урадавая камісія па адзначэнню 25-гадовага юбілея тэатральнай творчасці заслужанага артыста рэспублікі **М. Ф. Рафальскага** намеціла правесці ў пачатку снежня ўрачысты сход, прысвечаны юбіляру. На сходзе, апрача партыйнага, совецкага і профсаюзнага актыва, прымуць удзел рэжысеры, мастакі, кампазітары, тэатральныя работнікі Масквы, Ленінграда, Харкава.

К юбілею выходзіць з друку зборнік творчасці М. Ф. Рафальскага.

Усесаюзны рэкорд хуткасці хадзьбы

Тт. Байко, Граднеўскі і Ершоў—чырвонаармейцы №-га палка НКУС устанавілі новы ўсесаюзны рэкорд на хуткасць хадзьбы. Гэтымі днямі яны прайшлі 100 кілометраў за 17 гадзін 38 мінут (стары ўсесаюзны рэкорд—22 гадзіны), у тым ліку 40 кілометраў у процігазах.

Следам за тт. Байко, Граднеўскім і Ершовым ішла машына з доктарам і судзейскай калегіяй. Калі чырвонаармейцы прыйшлі ў Менск, іх уважліва агледзеў доктар, які адзначыў іх фізічны стан на «выдатна».

Беларускі совет «Дынамо» узнагародзіў тт. Байко, Граднеўскага і Ершова імяннымі гадзіннікамі.

15 лістапада ў 7 гадзін вечара рэдакцыя газеты «Звязда» склікае **нараду дэпутатаў горсовета** з заводаў імя **Варашылава, «Комунар», «Большэвік»,** імя **Мяснікова, «Пролетарый», ланцугоў Гапля** і фабрык імя **Кагановіча,** імя **Крупскай, «Окцябр», «Комунарка», «Усход», «Чырвоная зорка»,** менская электрастанцыя, ТЭЦ, друкарні імя **Сталіна** і дэпутатаў з іншых прадпрыемстваў і ўстаноў, якія прымалі ўдзел у рабоце брыгад па праверцы выканання наказу Менскага горсовета.

Нарада адбудзецца ў памяшканні рэдакцыі «Звязды» (Совецкая 68 3 паверх), у пакоі аддзела совецкага будаўніцтва.

15 лістапада а 7 г. вечара ў габінеце рэдактара «Звязды» адбудзецца НАРАДА ПРАДСТАЎНІКОЎ УСІХ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ гор. Менска па пытанню асвятлення жыцця і работы ВНУ ў «Звяздзе».

На нараду запрашаюцца дырэктары ўстаноў, сакратары парткомаў і рэдактары шматтыражак і насценных газет.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Рамашк. БДТ—1 Белдзяржтэатр Оперы і Балета
тэл. 24905
Мастацкі кіраўнік—засл. артыст рэспубл І. Р. ГІТГАРЦ
15 лістапада для Працаеветы
опера
ПІКАВАЯ ДАМА
у 4 дзеях, муз. Чайкоўскага
Пачатак роўна ў 8 гадзін веч.

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый" | Гукавы мастацкі фільм **„МЕЧТАТЕЛИ"** У фэйэ — канцэрт. адз.

Кіно „Інтэрнацыянал" | Сёння **НОВАЯ ПРАГРАМА**

Кіно **„СПАРТАК"** Ад 14 лістапада лепшы мастацкі фільм **БУЛАТ БАТЫР** драма ў 7 частках. У праграме—кіно-хроніка Штодзённа 4 сеансы. Каса—з 4 гадз. дня.

МЯНЯЮ асобн. пакой 30 кв. м., у цэнтры, **на два пакоі.** Можна ў розных раёнах. Даведацца: Пл. Волі, 29 кв. 6, ад 6 да 8 г. в.

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ
выклікае усіх загадчыкаў клубаў, кінотэатраў, адміністратараў тэатраў на **нараду** па пытанню
падрыхтоўкі памяшканняў да перавыбараў совета.
Нарада адбудзецца сёння, 14-XI у 7 г. вечара ў памяшканні горсовета (пакой № 38)
Павінны з'явіцца:
1. **Загадчыкі клубаў:** сувязі, імя Леніна, працаветы, хлебазавода, друкароў, імя 13-годдзя, імя VIII з'езда профсаюзаў, медработнікаў, Дома селяніна, скурнікаў, глуханямых, інвалідаў, Эльвода, будаўнікоў, імя Ільича, Дома партактыва, імя Сталіна, металістаў, пісьменнікаў, „Чырвоны абутнік" і комунальнікаў 2. Загадчык Дома тэхнікі. 3. Каменданты: БДУ, політэхнічнага інстытута, ВКСГШБ (комвуз). 4. Загадчыкі кіно „Чырвоная зорка", „Пролетарый". 5. Адміністратары тэатраў БДТ—1, Яўрэйскага дзяржаўнага і польскага дзяржаўнага тэатраў.
Гарадская выбарчая камісія.

Гукавы кіно-тэатр **«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА».** **Ад 14-га лістапада**
вялікі мастацкі гукавы фільм па твору **ОСТРОЎСКАГА**
вытворчасць Ленінградскага кіно-аб'яднання „ЛЕНФІЛЬМ"
ГРАЗА
Звыш праграмы апошняя гастроль універсальнага артыста іллюзіяніста трансфармэтара **Отто ФРАНКАРДЗІ**
ШТОДЗЕННА ТРЫ СЕАНСЫ, пачатак у 6 г. 30 мін., 9 гадз. і 11 гадзін.
Каса—з 1 г. дня. Спазніўшыяся на сеанс не дапускаюцца.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
ВЫШАЎ з ДРУКУ і разаслан па месцы
БЛОКНОТ АГІТАТАРА № 2 ДА ПЕРАВЫБАРАЎ СОВЕТАЎ.
Стар. 51. Тыр. 8000. Цана 35 кап.
Патрабуйце ва ўсіх магазінах ДВВ, БАКТ'а і ў магазіне Партвыдавецтва, Совецкая, 61.

Да ведама навуковых работнікаў
Цэнтральнае бюро секцыі навуковых работнікаў **напамінае,** што апошні тэрмін прадстаўлення прац **па КОНКУРСУ,** абмеркаванаму камісіяй сядзейнасці навуковых устаноў СНК БССР на лепшыя навуковыя даследчыя працы,
КАНЧАЕЦЦА 30-XII—34 г.
Працы прасіць прыслаць па адрасу: Менск, Комуністычная, 17, дом навуковых, т. Юраш Ковічу, для конкурснай камісіі.
ЦБ СНР.

ШУКАЮ 1—2 пакоі. Згодзен на рамонт і інш. выдаткі. Звяніць 21—360.

Прапаў хлапец заікаў АЛЕКСЕЙ, 17 год. нямы, малы нага росту, валасы беларускія. Аб месцы знаходжання прашу паведаміць: БССР, Буда і вышэйшая, вёска Шарыбаўка, Дані де Заікаву.

7-X—34 г. з м. Ушачы пайшоў хлопец Каволеўскі Барыс, 13 г., валасы чорныя. Ведаючых яго месцазнаходжанне прашу паведаміць: пошта Ушачы, БССР, М. Кавалеўскай.

БАЛАНС

гаспадарчых сродкаў Беларускага дзяржаўнага трэста шчаціна-шчотачнай, воласапрадзільнай прамысловасці „БЕЛШЧАЦІНА"

на 1-е студзеня 1934 г. і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага баланса на 1-І 1933 г.

АКТЫЎ:	СУМА: На 1-1—1933 г.	На 1-1—1934 г.
I. Асноўныя сродкі		
1. Вытворчага значэння дзейнічаюч.	2292787—70	2339046—60
2. „ „ недзейніч.	18528—09	46313—55
3. Невытворчага значэння	181382—74	216611—87
Усяго па I раздзелу	2492698—53	2601972—02
II. Вытворчыя запасы на складах і ў пуці		
1. Сыравіна, асноўн. і дапаможн. матэрыялы, тара	967760—44	880432—10
2. Паліва	1897—82	8 98—74
Усяго па II раздзелу	969658—26	888830—84
III. Нязкончаная прадукцыя:		
1. Астача незавершан. вытворч. і паўфабрыкаты (сваіх)	329125—85	296979—71
2. Нязкончан. капіт. работы	142260—69	242406—03
Усяго па III раздзелу	471386—48	539385—74
IV. Таварныя запасы:		
1. Тавары і фабрыкаты (на складах і ў пуці)	442010—53	614011—00
2. Тавары, адгружаныя і неаплочан.	825489—38	673014—03
3. Матэрыялы для рэалізацыі і неліквіды	1803—85	16112—19
Усяго па IV раздзелу	1269303—71	1333137—22
V. Грашовыя сродкі.		
1. Разліковыя і асобныя рахункі ў крэдытных установах	358800—69	312615—78
2. Каса і грашовыя пераводы	6171—00	65141—66
Усяго па V раздзелу	364971—69	377757—44
VI. Разлікі		
1. Справаздачныя сумы	43345—74	22741—99
2. Дэбіторы	500843—27	352108—05
3. Разлікі з бюджэт. рэспубл.	896000—00	538378—00
4. Выдаткі будучых гадоў	32398—95	12079—28
Усяго па VI раздзелу	1472587—96	925307—32

ПРАЦЯГ АКТЫВА	СУМА: На 1-1—1933 г.	На 1-1—1934 г.
VII. Выдзеленыя сродкі		
1. Каштоўныя паперы	6946—58	6976—58
2. Паі, акцыі і ўдзел у інш. арганіз.	138000—00	25000—00
3. Уклады ў крэдытныя установы:		
а) у Цэкабанк Фубр	215000—00	365000—00
б) у Промбанк	2652—40	30587—18
в) у Цэкабанк уласн. укладан.	—	2266—83
г) у Усекабанк	—	33000—00
д) уклады ў ЗРК	35000—00	162287—45
Усяго па VII раздзелу	397598—98	625118—04
БАЛАНС	7438205—61	7291508—62
ПАСІЎ		
I. Унутраныя рэсурсы		
1. Статутныя фонды	2938883—78	4283807—62
2. Матавыя фонды:		
а) фонд амартызацыі	134668—69	193048—96
б) фубр	201596—57	358086—40
в) іншыя	71447—72	89704—97
3. Рэзервы	43462—86	104193—78
Усяго па I раздзелу	3390059—62	5028841—73
II. Пазыкавыя сродкі		
1. Доўгатэрміновыя крэдыты	232000—00	364804—62
2. Кароткатэрміновыя ссуды	337800—00	233000—00
3. Разлікі з бюджэтам рэспубл.	174570—41	—
4. Крэдыторы	813462—80	589713—36
Усяго па II раздзелу	1557833—21	1187517—98
III. Накапленні (прыбытак)		
1. За справаздачны год	2490312—78	1075148—91
Усяго па III раздзелу	2490312—78	1075148—91
БАЛАНС	7438205—61	7291508—62

СТРАТЫ. РЭЗУЛЬТАТЫ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЗА 1933 г.	СТРАТЫ	ПРЫБЫТКІ
1. Страты ад ліквідацыі выбыўшай маемасці	14665—97	
2. Страты ад спісання безнадзейных даўгоў з-за пропускам тэрміна даўнасці	54732—14	
3. Адлічэнні ў фонд тэхпрапаганды	32599—16	
4. Іншыя страты	58146—99	
5. Страты мінулых год	42936—24	
УСЯГО	203080—50	
Чысты прыбытак	1075148—91	
УСЯГО	1278229—41	
1. Прыбытак ад рэалізацыі тавараў і матэрыялаў		1002710—81
2. Прыбытак ад ліквідацыі выбыўшай маемасці		2919—94
3. Прыбытак ад паступлення па безнадзейных даўгах і ад спісання крэдыторскай запазычанасці за пропускам тэрміна даўнасці		165432—60
4. Іншыя прыбыткі		16350—99
5. Прыбыткі мінулых год		90815—07
УСЯГО		1278229—41

Баланс разгледжан і зацверджан балансавай камісіяй НКЛП БССР (прат. № 9 ад 5.V—34 г.) і справаздачна-эканамічным сектарам, да друкавання дазволены.

За нач. СЭС НКЛП БССР **ГОРШТЭЙН.**

Кіраўнік трэста „Белшчаціна" **ГЕФЕН.**

Галоўны бухгалтар **ГОРОДЗЕНСКІ.**

Нізжэйпералічаныя таварышы, вызначаныя для правядзення справаздачна-выбарчай кампаніі Менскага гарадскога совета

выклікаюцца

НА ІНСТРУКЦЫЙНУЮ НАРАДУ,

ЯКАЯ АДБУДЗЕЦЦА **16-XI** У 7 гадз. вечара ў Доме партактыва

Яўка абавязкова. На нараду ў абавязковым парадку павінны з'явіцца члены бюро секцый і старшыні дэпутацкіх груп.

Менгарком КП(б)Б ХАДАСЕВІЧ.

Кузняцова (гарана), Розенгаўз (Комунбанк), Егорычаў (УНР-98), Этле (Кам. паліва), Сафі'ян (Горуну гандаль), Варончанка (ГК КП(б)Б), Залескі (гарфа), Гераўкер (ЦСПСБ), Галкоўскі (ГК ЛКСМБ), Салдаценка (гарадраў), Яноўскі (райваенкамат), Сулькіна (НКМясцов. прамысл.), Клілеўскі (НКФін), Тавакальян (ЦК КП(б)Б), Старавойтаў (ВКСТШ), Гурэвіч II. (Наркамунугандаль), Пасюкевіч (ЦК КП(б)Б.) Дупец (НКАсветы), Готфрыд (ЦК КП(б)Б), Конік (ЦК КП(б)Б), Гінзбург (горпракуратура), Гершон (ЦК КП(б)Б), Крэйніи (Менгорспажыўсаюз), Каранеўскі (Наркамзем), Позняк (Металалом), Казачэнка (Паж. ахова), Рапапорт (горсовет), Хейфец («Рабочий»), Зайчык (ЦСПСБ), Гурло (Інстр. нар. гасп.), Гарбатаў (ПВО), Гіндзіна (Наркомасветы), Свірыдаў (Нар. кам. мясцов. прам.), Ленцнер («Звязда»), Гельфанд (гарадраў), Юдзін (добрабыт), Верба (Наркамунугандаль), Александровіч (саюз пісьменнікаў), Адам (ЦСПСБ), Межуеў (палітсектар НКЗ), Кузняцоў (горсовет), Джэлюк («Звязда»), Дубіна (АСО), Шараў (НКВД), Грыцкевіч (ЦП працасветы), Серыкаў (міліцыя), Жудзельскі (Верхсуд), Ляшчынскі (НКАсветы), Амбражунас (ЦК Ф'ас.), Матусевіч (БКС), Клімковіч (Саюз пісьмен.), Захарава (ЦП канс. зав.), Ляўкова (гістпарт), Сааллер (палітсектар НКЗ), Стукалаў (ЦК ЛКСМБ), Астроўскі (горжылсаюз), Олікер (Наркам ах. здароўя), Браўковіч (ДВБ), Эпштэйн (гарфа), Пінхасік (Заготлён), Дэрман (гал. кір. мін.), Місенкоў (УВСР-98), Баумсаў (ПВО), Блоўштэйн (ЦК КП(б)Б), Варанецкі (пракуратура), Бэр (рэд. «Окцябр»), Майзіт (ЦВК), Пятрова (НК Асветы), Партной (ГК КП(б)Б), Гурэвіч (нарсуд), Баршчэўская (НК Асветы), Сухаручкін (МДЭС), Пракоф'ева (ЦСПСБ), Варно (ГК КП(б)Б), Кузняцоў (ГК КП(б)Б), Клябанаў (ЦП саюза РДУ), Краснікаў (ГК КП(б)Б), Манжалей (ЦП саюза), Пучкін (трэст зял. буд.), Глезераў (Наркамюст), Дарціс (Чырв. крыж), Ашак (Наркамсабез), Аўсутанціс (ЦК ЛКСМБ), Варанкоў (Інст. мясц. прамысл.), Цаплоў (міліцыя), Пятрухін (Ментрамвай), Станкевіч (Водаканал), Шастакоў («Калг. Беларусі»), Бандарчык (газ. «Большэвік»), Цялятнікаў (УВСР-98), Дэйч (зав. імя Варашылава), Купрыянаў (кір. гаспін.), Канопік («Окцябр»), Кейлін (промбанк), Шолкаў (з-д імя Варашылава), Гінзбург (ЦК Чырв. крыжу), Іпатаў (горсовет), Залескі (парт. камісія) Сідранскі (нарсуд), Багарад (ЦП саюза грам. харч.), Эпштэйн (ГК КП(б)Б), Фішбейн («Рабочий»), Гераўкер ЦК КП(б)Б, Турэпкі (РВК), Давідовіч (Наркомсоз). Валодзька (сувязь), Дз'яжаў (БДУ), Лапідус (ГК ЛКСМБ). Жарскі («Орка»), Багдановіч (Мелінстытут), Левія (ЦП саюза буд.), Сакалінскі (ЦП медсанпрацы), Маршак (тубінстытут), Рохлін (ЦП гарбароў), Кузьмін (Наркамюст), Пілішчак, Дружалоўскі (Палітэхн. інстытут), Рубінштэйн (ЦСПСБ). Курыцкая (ЦП саюза канд.), Страле (НКЗем), Драбышэўскі («Комунарка»), Карасік (з-д імя Молатава), Плоткін (горспажыўсаюз), Цёмкін (друкарня імя Сталіна), Казлоўскі (друкарня імя Сталіна), Ханкевіч (НКФ), Фрэйдэ (чыгунка), Каждан (палітаддзел чыгункі), Жарын (РВК), Шімес (фка імя Кагановіча), Шадура (АБВШ), Алёхін (АБВШ), Панамароў (гарза), Скурман (з-д імя Молатава), Кіраў (нач. палітаддз.), Баран (Бімзо), Пасса (ЦК КП(б)Б), Кудзелька (ЦК КП(б)Б), Любін, Юнт, Вайнер, Біруля, Гарачоў, Зарын, Шахмазараў, Іванаў.

ЗАГАД

ПА НАРОДНАМУ КАМІСАРЫЯТУ АСВЕТЫ БССР

10 лістапада 1934 г.

г. Менск

За невыкананне пастановы СНК БССР ад 3-III 1934 г. і майго загаду ад 2-IV 1934 г. аб завочным навучанні настаўнікаў і арыў плана гатага мерапрыемства па раёнах Гураўскаму і Нараўлянскаму, ігнараванне майго загаду ад 29-IX г. г. аб завочным навучанні—абвяшчаю:

загадчыкам Тураўскага і Нараўлянскага райсаўнаёў мову з занясенням азначаных спагнанняў у іх працоўныя спісы.

Нам. народнага камісара асветы БССР ЛЯШЧЫНСКІ.

ЗАГАД

ПА МЕНСКАМУ ГарАНА

ад 5-XI—1934 г.

Праверкай устаноўлена, што выкладчык фізікі 42-ой школы Сякерыч сістаматычна прыходзіць у клас непадрыхтаваным, чытае лекцыю вучням з падручніка, канспекта, дае вучням няправільныя тлумачэнні, няправільных адказаў вучняў не папраўляе, а наадварот, згаджаецца з імі. У працы зусім не выкарыстоўвае фіз. кабінет, які ёсць у школе, выклікае да дошкі па 2-3 вучні, якіх трымае па 20 мінут.

Выходзячы з адзначанага, Сякерыча з працы выкладчыка школ г. Менска зняць.

Заг. гарАНА КУЗНЯЦОВА.

Менск. друкарня «Звязды». Выпускаючы—КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК ст. матранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. старэматыпір — КАГАН Е., ст. друкар — АНУЧЫК. Уп. Галоўлітбела № К—3293.